

АДПАЧЫВАЙ, А ПАРАДАК НЕ ПАРУШАЙ 4-5

«ЗАЛАТЫ» АГРАТЫДЗЕНЬ 9



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 110 (29990)

## КОРАТКА

• Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі ў студзені — красавіку склаў $30,6 млрд.



• **У Жлобіне 200 самбістаў апрабуюць дыван на Кубку Беларусі перад II Гульнямі СНД.**

• «Белавія» дадала яшчэ адзін рэйс у Туркменбашы.



• **Дыпломы аб вышэйшай адукацыі атрымалі больш за 300 выпускнікоў Акадэміі МУС.**

• З пачатку года ў Беларусь прыбылі больш за 25,7 тыс. грамадзян Украіны.

З першых вуснаў

# «НАМ ТРЭБА АРЫЕНТАВАЦЦА НА СВАЕ СІЛЫ І НА СЯБЕ»

## Прэзідэнты Беларусі і Расіі правялі сустрэчу ў Сочы

**Беларуска-расійскія адносіны з'яўляюцца стрыжнем супрацоўніцтва на прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза і Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Сочы.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сустрэча двух лідараў у Сочы была запланавана даўно. Гэтымі днямі тут якраз праходзяць пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета і Савета кіраўнікоў урадаў СНД.

«Мы яшчэ ў Маскве з Вамі дамовіліся, што ў гэты час перасячэмся. Якраз прэм'еры нашы будуць працаваць. Усё ж такі беларуска-расійскія адносіны з'яўляюцца стрыжнем. Калі раптам будуць пытанні, мы адрэагуем. Вы якраз будзеце сустракацца з прэм'ер-міністрамі. Я лічу, што гэта комплекснае, добрае мерапрыемства, якое мы праводзім. Так, ёсць эканамічныя пытанні. Яны вырашаюцца. Ёсць куды рухацца. Самае галоўнае — мы ведаем, што рабіць і ў якім кірунку рухацца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Электратранспарт у нас у краіне развіваецца. Усё больш людзей аддаюць перавагу электрамабілям як экалагічнаму і эканамічнаму віду транспарту. Дзякуючы стымуляцыйным мерам, прынятым на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, сістэмнай рабоце ўрада, колькасць электратранспарту ў краіне павялічваецца: і электрамабіляў, і электробусаў. Вельмі прыемна, што грамадскі электратранспарт курсіруе на маршрутах не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах нашай краіны».*

Сацыяльны аспект

# МАБІЛЬНЫ ДОКТАР У АДДАЛЕНАЙ ВЁСЦЫ




## У многіх раёнах Брэстчыны працуюць перасоўныя медыцынскія комплексы

**На нарадзе па актуальных пытаннях аховы здароўя, што адбылася ў маі ў Палацы Незалежнасці, шмат увагі ўдзялялася стану медыцыны на сяле. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў падыходзіць да пытання ўзважана, абдумана, зыходзячы найперш з інтарэсаў людзей. «Закрывайце, аптымізуйце, ніхто ж не супраць, — сказаў Прэзідэнт. — Але спачатку комплексы на колах завязіце, якімі вы хочаце замяніць ФАПы, а потым закрывайце». Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што датычыцца аргументаў наконт эканоміі сродкаў. Паводле яго сцвярджэння, трэба яшчэ паглядзець, наколькі вялікія затраты на ўтрыманне ФАПа, дзе працуюць два чалавекі.**

СТАР. 3

Соцыум

# ТАНЦПЛЯЦОЎКА, ЁГА І НАРМАТЫЎ ГПА

## Як у Беларусі рэалізоўваецца стратэгія актыўнага даўгалецця?

**З 2020 года ў Беларусі дзейнічае нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце – 2030». Якія мерапрыемствы ў яе рамках праходзяць у нашай краіне і як да іх далучыцца? Што прапаноўваюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва для цікавага і актыўнага баўлення вольнага часу пажылым людзям? Як у гэтым дапамагаюць адноўленыя танцавальныя пляцоўкі ў парках? Якія методыкі актыўнага даўгалецця сёння папулярныя? Навошта да актыўнага ладу жыцця прыцягваць моладзь? І ці каму пад сілу здача нарматываў ГПА («Гатовы да працы і абароны»)? Так, сёння адноўлена такая магчымасць і праверыць сябе можа кожны. Пра гэта расказалі спецыялісты.**

СТАР. 11



ISSN 1990 — 763X

23110

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## «НАМ ТРЭБА АРЫЕНТАВАЦЦА НА СВАЕ СІЛЫ І НА СЯБЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«І атрымліваецца. Дзякуй богу, атрымліваецца», — заўважыў Уладзімір Пуцін.

«Мы думалі, будзе горш. Але пакуль крыху лепш, чым мы думалі. І дзякуй богу. І так паволі мы адбудуем нашы адносіны. Я ўжо публічна сказаў у нас на сходзе сакратароў саветаў бяспекі: мы з Расіяй прадумаем план дзеянняў у гэтай сітуацыі. Спадзявацца на тое, што санкцыі адменяць, яшчэ нешта — нам пра гэта нават казаць не трэба. Нам трэба арыентавацца на свае сілы і на сябе. І калі мы выпрацуем такі план нашых дзеянняў, нашы партнёры абавязкова падключацца. Я ўпэўнены, Казахстан у рамках ЕАЭС і Узбекістан. І створым тут прывабныя умовы. Я ўпэўнены, што наш саюз будзе толькі мацнейшы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы цяпер пагаворым па ўсіх пытаннях: і па пытаннях бяспекі, эканамічнага ўзаемадзеяння. Ёсць пра што паразмаўляць», — сказаў Уладзімір Пуцін, вітаючы свайго беларускага калегу.

Паводле яго слоў, тое, як развіваецца эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін, не можа не радаваць, а яго тэмпы Прэзідэнт Расіі лічыць «незвычайна добрымі».

«Якасць узаемадзеяння, структура нашых эканамічных узаемаадносін мяняюцца ў патрэбны бок. Перш за ўсё ўпор робіцца не толькі на традыцыйную галіну, але і на высокатэхналагічныя сферы. Гэта не можа не радаваць», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

Гаворачы ў цэлым аб сітуацыі ў сферы бяспекі, Уладзімір Пуцін ахарактарызаваў яе як стабільную. «Я б нават сказаў, добрая, упэўненая. Мы ўзаемадзейнічаем у гэтай сферы. Па найбольш вострых пытаннях, аб якіх мы з Вамі дамаўляліся, усё ідзе па плане: 7-8 ліпеня заканчваецца падрыхтоўка адпаведных збудаванняў, і адразу пачнём мерапрыемствы, звязаныя з размяшчэннем на Вашай тэрыторыі адпаведных відаў узбраенняў. Так што ўсё па плане, усё стабільна», — сказаў расійскі лідар.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

Прадметная размова

# Персанальная адказнасць за сваю тэрыторыю

### Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла з вертыкаллю Мінгарвыканкама і кіраўнікамі адміністрацый сталічных раёнаў

**Падчас нарады, якая адбылася ў Савеце Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Мінску заслухала інфармацыю аб выніках работы сталіцы за першае паўгоддзе, дала канкрэтныя ўстаноўкі на найбліжэйшую перспектыву. У першую чаргу Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на выкананне паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця горада. Наталля Качанава нагадала: на папярэдняй нарадзе было дамоўлена, што Мінск сур'ёзна дадасць па ўсіх паказчыках.**



Фота БелТА.

«Эканоміка — перш за ўсё, — падкрэсліла яна. — Пра гэта кажа кіраўнік дзяржавы. Будзе працаваць эканоміка — выканаем усе сацыяльныя гарантыі, якія абяцалі людзям. Нам сёння проста жыццёва неабходна сур'ёзна дадаць у аб'ёмах прадукцыі, якая выпускаецца. Гэтую задачу ставіць Прэзідэнт нашай краіны. Дзе магчыма, у адпаведнасці з магутнасцямі прадпрыемстваў, трэба падвоіць выпуск прадукцыі, якая карыстаецца попытам».

Наталля Качанава прывяла канкрэтныя прыклады. «Сёння на расійскім рынку запатрабаваныя ліфты — значыць, іх трэба выпускаць, — паставіла яна задачу. — Што датычыцца Мінскага аўтамабільнага завода, сёння патрэбны аўтобусы. «Камунарка», «Слодыч» — усё сёння запатрабавана. Толькі трэба сур'ёзна працаваць над гэтым. Уладзімір Яўгенавіч (*Кухараў, старшыня Мінгарвыканкама. — «Зв».)* быў ва Ульянаўскай вобласці, ён бачыў, наколькі там наша прадукцыя патрэбна. Таму трэба сур'ёзным чынам ставіць задачу нашым прадпрыемствам па павелічэнні аб'ёмаў прадукцыі, што выпускаецца. Той, якая сёння мае свайго пакупніка і рынкі збыту і ў Расіі, і ў іншых краінах. Сёння — акно магчымасцяў. У гэтым няма ніякага сумнення».

У гэтым плане, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, вялікае значэнне мае супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі. Яна расказала, што ўжо на стадыі падрыхтоўкі да Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ў канцы чэрвеня адбудзецца ва Уфе, заключаюцца кантракты і пагадненні.

Аднак, як акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава, эфектыўна працуючы на экспарт (летась толькі лёгкая прамысловасць паставіла за мяжу прадукцыі на 2 мільярды долараў), важна не забываць і пра ўнутраны рынак. У гэтай сувязі пастаўлена задача — максімальна забяспечыць напаўненасць крам прадукцыяй айчыннай вытворчасці.

Асобна спікер спынілася на кадравым пытанні. Па словах Наталлі Качанавай, сёння патрэбна падбіраць такое кіраўніцтва, якое будзе выконваць даручэнні. «Мінск — не той горад, дзе мы не можам набраць кадры», — перакананая яна.

Звярнула ўвагу ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе і на пытанне забеспячэння годных умоў працы і бяспечнай вытворчасці. У гэтай сувязі кіраўнікам адміністрацый раёнаў сталіцы пастаўлена задача аб'ехаць усе прадпрыемствы і пракантраляваць выкананне даручэнняў.

«Так, ёсць старшыня Мінгарвыканкама, але кожная асобна ўзятая адміністрацыя — гэта зона вашай адказнасці, дзе вы павінны займацца ўсімі пытаннямі: пачынаючы ад эканомікі і заканчваючы правапарушэннямі, злачынствамі, — звяртаючыся да кіраўніцтва горада, акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Вы несяце персанальную адказнасць за падведамасную вам тэрыторыю і тых людзей, якія там пражываюць».

Напрыканцы нарады Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што, калі ёсць пытанні, якія неабходна вырашаць на ўзроўні рэспубліканскіх органаў кіравання, або ёсць патрэба ў заканадаўчым урэгуляванні некаторых момантаў, кіраўнікі адміністрацый раёнаў Мінска могуць смела звяртацца да яе. «Не трэба баяцца таго, захаваеце вы сваю пасаду або не, — заўважыла Наталля Качанава. — Трэба баяцца іншага: каб мы захавалі мір і спакой».

**Вераніка КАНЮТА.**

Шляхам інтэграцыі

# ПРЫЯРЫТЭТНЫ ХАРАКТАР ЕЎРАЗІЙСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Падчас пленарнай сесіі на Еўразійскім кангрэсе'23 у Сочы Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА расказаў пра важнасць і значэнне для Беларусі еўразійскай інтэграцыі ў сучасных умовах.**




Фота БелТА.

Гаворачы аб санкцыйным націску з боку Захаду, Раман Галоўчанка адзначыў: «Пад прамым юрыдычным дзеяннем заходніх санкцый аказалася чвэрць беларускай эканомікі. Фактычна мы страцілі нашы традыцыйныя рынкі краін суседзяў. З улікам таго, што ўсе галіны так ці інакш пераплятаюцца, ёсць кумулятыўны эфект. Астатнія сектары эканомікі былі закрануты ўскосна. Разлік, вядома, быў зразумелы — пад такім санкцыйным ударам эканоміка павінна была пацярпець».

Ён дадаў: «Заходнія навуковыя прагназісты нам выпісвалі не менш як дваццаціпрацэнтнае падзенне ВУП. Каб было зразумела: доля экспарту ў ВУП Беларусі — больш за 60 працэнтаў. Эканоміка характарызуецца высокай ступенню адкрытасці. З $76 млрд ВУП мінулага года $40 млрд — гэта экспарт. Лічбы гавораць аб высокай ступені адкрытасці і ўразлівасці эканомікі да знешніх шокаў. Вядома, мы не маглі з гэтым змірыцца».

«У сціслыя тэрміны было выбудавана антыкрызіснае кіраванне эканомікай. На знешнім контуры галоўная ўвага была ўдзелена падтрымцы экспарцёраў, аднаўленню лагістыкі, сістэмы разлікаў. На ўнутрыкраінавым узроўні былі прыняты неабходныя рашэнні па забеспячэнні бесперабойнай работы прадпрыемстваў, максімальным і аператыўным імпартазамяшчэнні, жорсткім кантролі цэнаўтварэння. Мы адаптаваліся да новай рэальнасці за шэсць месяцаў. Са жніўня мінулага года ідзе аднаўленне эканомікі», — рэзюмаваў кіраўнік урада.

Раман Галоўчанка падкрэсліў: «Гэтыя меры не былі б эфектыўнымі самі па сабе без выкарыстання магчымасцяў інтэграцыі, узаемадзеяння ў фармаце як Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, так і ЕАЭС. Фактычны прырост у гандлі з ЕАЭС выраўнаваў выпадаючы экспарт з недружалюбных краін. Гэта галоўны адказ на пытанне, што дае нашым краінам членства ў ЕАЭС».

«У рамках Саюзнай дзяржавы негатыўны эфект ад заходніх санкцый дастаткова эфектыўна нівеліруецца за кошт пашырэння ўзаемадзеяння па ўсіх кірунках. Вы ведаеце, што прэзідэнты Расіі і Беларусі падпісалі 28 саюзных праграм, якія мы цяпер рэалізоўваем і якія нацэлены на паступальнае паглыбленне інтэграцыі», — адзначыў кіраўнік урада. — Як прыклад — у сціслыя тэрміны дзякуючы актыўнай падтрымцы з боку нашых расійскіх сяброў была настроена на альтэрнатыўны кірунак лагістыка экспартных гандлёвых патокаў. Актыўна выкарыстоўваюцца больш за 20 партоў Расіі замест закрытых партовых магутнасцяў Прыбалтыкі і Украіны».

Прэм'ер-міністр адзначыў: «Для Беларусі ў сувязі з гэтым еўразійская інтэграцыя мае прыярытэтны характар. Мяркую, усе пагодзяцца, што нашы агульныя рашэнні па мінімізацыі наступстваў не толькі санкцыйнага націску, але і ў цэлым высокай турбулентнасці глабальнай эканомікі дазволілі ўсім краінам «пяцёркі» павысіць устойлівасць нацыянальных эканомік. На фоне санкцыйных абмежаванняў і пратэкцыянізму саюзны ВУП па выніках 2022 года знізіўся ўсяго на 1,6 працэнта. Гэта ў 2 разы ніжэй, чым прагназавалі эксперты. Нядрэнныя перспектывы праглядаюцца ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, актывізавана работа па забеспячэнні ў ЕАЭС тэхналагічнага суверэнітэту».

**Паводле БелТА.**

# МАБІЛЬНЫ ДОКТАР У АДДАЛЕНАЙ ВЁСЦЫ

## КОМПЛЕКС ЗАМЕСТ ФАПА

Пытанне аптымізацыі сельскай медыцыны паўстала на парадак дня не сёння і не ўчора. З памяншэннем колькасці насельніцтва пэўныя ўстановы аховы здароўя ўсё ж даводзіцца закрываць. З улікам гэтых абставін і быў у свой час распрацаваны перасоўны медыцынскі комплекс, які ўяўляе сабой міні-паліклініку на колах. Брэстчына стала адным з першых рэгіёнаў, які атрымаў такую машыну, аснашчаную ўсім неабходным абсталяваннем.

Перасоўны медыцынскі комплекс з'яўляецца амбулаторна-паліклінічным, ён прадугледжаны для правядзення прафілактычных медыцынскіх аглядаў, дыспансерызацыі насельніцтва, а таксама планавай медыцынскай дапамогі. Медработнікі могуць тут праводзіць розныя медыцынскія ўмяшанні, дыягностыку, лабараторныя даследаванні, а яшчэ робяць прышчэпкі, ну і, вядома, праводзяць тлумачальную і асветніцкую работу.

Некаторыя населеныя пункты размешчаны даволі далёка ад амбулаторый, і шэраг людзей, асабліва пажылых, слабых, адзінокіх, не могуць своечасова дабрацца да доктара, каб хоць раз на год прайсці кваліфікаваны медыцынскі агляд. А тут спецыялісты прыязджаюць па месцы жыхарства.

Як паведаміла **спецыяліст аддзела грамадскага здароўя Брэсцкага абласнога ЦГЭі ГЗ Таццяна ГАПОНІК**, у канцы 2021 года аблвыканкам выдзеліў дадатковыя бюджэтныя сродкі для закупкі трох сучасных медыцынскіх перасоўных комплексаў. Яны паступілі ў Баранавіцкі, Пінскі і Брэсцкі раёны для паляпшэння якасці медыцынскіх паслуг і, галоўнае, іх даступнасці жыхарам нават самых аддаленых вёсак. На такой машыне цяпер медыцынская брыгада перыядычна накіроўваецца ў глыбінку.



Ідзе прыём на ўчастку Меднаўскай амбулаторыі ў вёсцы Рагозна.

## ГРАФІК — ПАД ПАТРЭБЫ

**Намеснік галоўнага ўрача Брэсцкай гарадской бальніцы № 2** (раней гэта была раённая бальніца Брэсцкага раёна. — **Аўт.**) **Яўген НАВАСАДСКІ** расказаў, што крыху больш як за год работы перасоўнага медыцынскага комплексу і спецыялісты, і мясцовая ўлада ўпэўніліся ў эфектыўнасці новай формы работы.

— Напрыклад, у зону абслугоўвання Чарнаўчыцкай участковай бальніцы ўваходзіць 19 населеных пунктаў. У гэтыя вёскі па чарзе комплекс выязджае па два разы на месяц. Урач агульнай практыкі не толькі наведвае пацыентаў свайго ўчастка, але і мае магчымасць зрабіць ЭКГ, узяць аналізы, правесці іншыя патрэбныя маніпуляцыі, — гаворыць Яўген Уладзіміравіч. — За мінулы год машына ажыццявіла 124 выезды, было прынята і агледжана каля паўтары тысячы чалавек. Важна, што 282 пацыенты пасля агляду накіраваны на далейшае даабследаванне. У выніку былі прыняты рашэнні аб шпіталізацыі, амбулаторным лячэнні альбо выдадзены рэкамендацыі пацыенту. Падкрэсліваю гэты факт, бо названыя людзі маглі б самі не звярнуць увагу на сімптомы, якія заўважыў урач, альбо палічыць іх неістотнымі. Гаворка ідзе пра жыхароў не самых блізкіх вёсак, якія не заўсёды самастойна выбіраюцца на прыём.

Выезды перасоўнага медыцынскага комплексу заўсёды рыхтуюцца загадзя. Аб прыездзе медыкаў людзі ведаюць за тыдзень, іх звычайна інфармуюць сельвыканкам і староста вёскі. «Але цяпер, дарэчы, улічваючы прапановы людзей, стараемся апавяшчаць яшчэ і праз сацыяльныя сеткі, тэлеграм-каналы, — дадае суразмоўнік. — Значыць, такая форма абслугоўвання набірае папулярнасць. Аб апошнім сведчыць і зваротная сувязь. На прамыя лініі паступалі прапановы ад жыхароў тых вёсак, дзе медыцынская машына яшчэ не была, — прыехаць да іх».

**Галоўны ўрач гарадской бальніцы № 2 Яўген КАПЫЛЕЦ**, які курыруе ахову здароўя Брэсцкага раёна, сказаў, што адначасова з работай комплексу вядзецца пошук спосабаў аптымальнага яго выкарыстання:

— Раней планавалі складаць графік і строга яго прытрымлівацца. Цяпер вырашылі, што галоўная задача — ахапіць як мага больш вёсак, даехаць да самай аддаленай. Таму графік можа быць скарэкціраваны пад надзённыя патрэбы і запыты медыкаў сельскіх устаноў аховы здароўя.

## У КАЗІШЧА — ШЭСЦЬ РАЗОЎ ЗА ГОД

Год таму перасоўныя медыцынскія комплексы атрымалі Кобрынская, Івацэвіцкая і Столінская цэнтральныя раённыя бальніцы. Як расказала карэспандэнту газеты **намеснік галоўнага ўрача Кобрынскай райбальніцы Аксана СІВЯНКОВА**, летась у сярэдзіне чэрвеня перасоўны медыцынскі комплекс прыступіў да работы. Якраз у гэты час быў скасаваны Казішчанскі фельчарска-акушэрскі пункт. Дык у вёску Казішча, дзе пражывае 103 чалавекі, медыцынская машына заязджала шэсць разоў на год.

— Унутры нашай машыны, як і іншых такіх жа, размяшчаецца некалькі міні-кабінетаў, дзе можа прымаць пацыентаў урач агульнай практыкі альбо вузкі спецыяліст, ёсць магчымасць зрабіць электракардыяграму, правесці забор крыві на аналізы, а таксама жанчынам прайсці агляд акушэра-гінеколага. Людзі ўжо ведаюць і актыўна ідуць на прыём да мабільнага доктара, — расказвае Аксана Алегаўна. — Кожны месяц я складаю графік выездаў. Звычайна на прыём прыязджаюць урач агульнай практыкі і памочнік урача. Урач найчасцей выязджае з той амбулаторыі, у зону адказнасці якой уваходзіць населены пункт. Акушэр-гінеколаг выязджае па асобным графіку. Такім чынам, за год мы ахапілі аглядам і прафілактыкай 1917 жыхароў у 103 населеных пунктах.

«Лічу, што медыцынская дапамога стала больш даступнай для жыхароў малых і аддаленых вёсак. Некаторыя, асабліва пажылыя, хворыя людзі, гадамі не выбіраліся ў медыцынскую ўстанову», — падсумавала Аксана Сівянкова.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ** пракаментаваў:

— У вобласці сёння функцыянуе 345 ФАПаў. У шасці раёнах працуюць перасоўныя медыцынскія комплексы. У гэтым годзе праведзена працэдура закупкі яшчэ чатырох комплексаў. Яны будуць накіраваны ў Іванаўскі, Бярозаўскі, Пружанскі, Ганцавіцкі раёны. Усё пералічанае мае на мэце паляпшэнне якасці і даступнасці медыцынскай дапамогі насельніцтву маланаселеных і аддаленых вёсак, на правядзенне прафілактычных медыцынскіх аглядаў і дыспансерызацыю работнікаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў без адрыву ад вытворчасці з выкарыстаннем дыягнастычных перасоўных комплексаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Японіі плануюць эвакуацыю звыш 200 тысяч чалавек з-за пагрозы апоўзняў



Улады японскай прэфектуры Сідзуока паведамілі аб пагрозе апоўзняў з-за моцных дажджоў, якія пайшлі пасля праходжання тайфуну «Мавар». Больш чым 200 тысячам жыхароў было разаслана прадпісанне эвакуіравацца ў бяспечнае месца, паведаміла газета «Известия». Як піша выданне, пагроза апоўзняў тычыцца перш за ўсё горада Хамамацу, бо з-за залеваў глеба аказалася моцна падмытая вадой. Згодна з прагнозамі, у найбліжэйшыя дні таксама чакаюцца моцныя дажджы, з-за чаго сітуацыя стане яшчэ больш небяспечнай. Паводле даных японскага метэаралагічнага агенцтва, у гэтыя выхадныя на паўднёвым захадзе Японіі ў горадзе Акінава можа прайсці тайфун. На наступным тыдні прагназуецца яго прасоўванне на паўночны ўсход уздоўж узбярэжжа вострава Хансю.

### Нью-Ёрк узначаліў сусветны рэйтынг гарадоў з самым брудным паветрам

Нью-Ёрк заняў першае месца ў сусветным рэйтынгу гарадоў з самым брудным паветрам на фоне моцных лясных пажараў у Канадзе. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на даныя сайта IQAir, які займаецца маніторынгам якасці паветра ў найбуйнейшых гарадах свету. Лясныя пажары ў Канадзе прывялі да таго, што Нью-Ёрк і некаторыя іншыя амерыканскія гарады аказаліся ахутанымі жоўтай смугой. Паводле звестак Дэпартамента аховы здароўя і псіхічнай гігіены Нью-Ёрка, у горадзе фіксуецца найгоршая з 1960-х гадоў якасць паветра. Мэр горада Эрык Адамс папярэдзіў, што абстаноўка будзе пагаршацца. Паведамлялася аб павелічэнні колькасці зваротаў у бальніцы пацыентаў з астмай, сардэчнымі прыступамі і інсультамі, а таксама з раздражненнем вачэй, скурным свербам і сыпам. Улады заклікалі грамадзян хадзіць па вуліцах у масках.

### У Егіпце закрылі ўсе пляжы ў раёне, дзе акула напала на расіяніна



Пасля смяротнага інцыдэнту з акулай Міністэрства навакольнага асяроддзя Егіпта ўвяло двухдзённую забарону на купанне ў моры, уключаючы падводнае плаванне і ўсе іншыя водныя віды спорту, у раёне паміж Эль-Гунай на поўначы Хургады і Сома-Бі на поўдні. Пра гэта паведаміла CNN. The Guardian піша, што мясцовыя ўлады перакрылі 74-кіламетровы ўчастак берагавой лініі. Аб нападзенні тыгровай акулы на чалавека на пляжы егіпецкай Хургады стала вядома 8 чэрвеня. Генконсул РФ у Хургадзе Віктар Варапаеў удакладніў, што загінуў расіянін 1999 года нараджэння. Па словах дыпламата, загінулы не быў турыстам, а на пастаяннай аснове пражываў у Егіпце. Трагедыя здарылася ў раёне гарадскога пляжа Dream Beach. Відавочцы паведамлялі, што хлопец падчас нападу акулы закрыў сабой дзяўчыну, яна паспела выплыць. За апошнія гады ў егіпецкім Чырвоным моры адбылося некалькі трагічных выпадкаў з акуламі. Паводле даных Міністэрства навакольнага асяроддзя Егіпта, летась дзве жанчыны (аўстрыйка і румынка) загінулі ў выніку нападу акул у моры на поўдні ад Хургады. «У 2020 годзе ўкраінскі хлопчык пазбавіўся рукі, а егіпецкі гід страціў нагу ў выніку нападзення акулы. У 2018-м акула забіла чэшскага турыста каля пляжа на Чырвоным моры», — паведаміла газета Al-Ahram Online.

## ЧЫГУНКА Ў ПАСАЖЫРАЎ «РУЛІЦЬ»

**По папярэдніх даных, у студзені–маі 2023 года Беларуская чыгунка перавезла ва ўсіх відах зносін больш за 24 мільёны пасажыраў, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**



Унутры краіны найбольш папулярнымі маршрутамі ў пасажыраў былі Мінск — Брэст, Мінск — Гомель і Мінск — Віцебск.

У міжнародных зносінах найбольшым попытам карысталіся цягнікі, якія курсіравалі паміж Мінскам і Масквой, Мінскам і Санкт-Пецярбургам.

Усяго з пачатку года ў міжнародных зносінах перавезена больш за аднаго мільёна пасажыраў, што амаль на 22 працэнты больш, чым за аналагічны леташні перыяд.

Цяпер паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй арганізаваны рэгулярныя пасажырскія зносіны ў напрамку Масквы, Санкт-Пецярбурга, Адлера, Калінінграда, Мурманска, Архангельска, Анапы і Самары (з 14 чэрвеня). Штотыдзень паміж дзвюма дзяржавамі курсіруюць каля 150 цягнікоў.

У маі 2023 года паслугамі Беларускай чыгункі скарысталіся каля шасці мільёнаў пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАДУХІЛІЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

## Карэспандэнты «Звязды» разам з супрацоўнікамі міліцыі праінспектавалі месцы масавага адпачынку

**КАЛІ для адных лета — бесклапотны перыяд, час адпачыць і, як у народзе кажуць, перавесці дух, то для іншых гэта напружаная і вельмі адказная пара. У рэжыме павышанай адказнасці нясуць службу супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Павышанай увагі патрабуюць месцы масавага адпачынку.**

Кожны дзень міліцыянеры патрулююць паркі, скверы, пляжы, іншыя тэрыторыі, дзе масава збіраюцца людзі. У адзін з вечароў да нарадаў патрульна-паставой службы далучыліся карэспандэнты «Звязды» і разам з імі паназіралі за абстаноўкай у найбольш папулярных сярод мінчан і гасцей сталіцы месцах адпачынку.

### І ПЕШШУ, І НА АЎТО, І НА КАТАРЫ

Наш рэйд пачаўся на набярэжнай Камсамольскага возера. Адна з любімых лакацый гараджан у летні перыяд. Тут заўсёды шматлюдна: адны купаюцца, іншыя прымаюць сонечныя ванны, нехта проста гуляе, хтосьці з кнігай у руках схаваўся ў цянёк. У спякотныя дні тут яблыку няма дзе ўпасці. І гэта зразумела: Камсамольскае возера — адно з трох месцаў на



тэрыторыі Мінска, дзе дазволена купацца.

— Купальны сезон стартаваў 15 мая, але ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы пачаліся яшчэ ў лютым, — расказвае **старшы інспектар па асобых даручэннях галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксандр МУХО.** — Мясцовыя органы ўлады вызначалі месцы масавага адпачынку, затым спецыяльная камісія даследавала іх на прадмет адпаведнасці патрабаванням аховы людзей на водах. Калі пэўныя недахопы выяўляліся, то яны аператыўна ліквідаваліся.

Пачынаючы з 15 мая нарады па ўсёй краіне заступілі на дзяжурства для аховы грамадскага правапарадку ў месцах масавага адпачынку. Служба нясецца штодзённа — на ўсіх вызначаных мясцовымі органамі ўлады месцах. Фактычна на ўсіх пляжах, буйных парках, зонах адпачынку — там, дзе збіраецца і адпачывае значная колькасць людзей. Правапарадак забяспечваюць супрацоўнікі патрульна-паставой службы, участковыя інспектары, міліцыянеры атрада асобага прызначэння, ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў. Пры неабходнасці прыцягваюцца і супрацоўнікі іншых падраздзяленняў, курсанты Акадэміі МУС.

— Тэрыторыя Камсамольскага возера і зона, якая да яго прылягае, вялікая, — заўважае **намеснік камандзіра роты па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Цэнтральнага РУУС Мінска падпалкоўнік міліцыі Мікалай МОЛЧАН.** — Невыпадкова нясём службу не толькі ў пешых разліках, але і ў складзе аўтапатруля. Акрамя таго, арганізавана сумеснае патруляванне на катарах, дзе супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і органаў унутраных спраў сочаць за тым, каб людзі не купаліся ў непрызначаных для гэтага месцах, не заплывалі за абмежавальныя буйкі.

Пры выяўленні парушальнікаў устаноўленых правілаў такія грамадзяне выцягваюцца з вады, пасля чага дастаўляюцца ў органы ўнутраных спраў. Перш чым заплываць за буйкі і купацца там, дзе гэта забаронена, аматарам экстрыму варта падрыхтаваць суму ў эквіваленце ад адной да трох базавых велічынь — менавіта такі штраф прадугледжаны за купанне ва неўстаноўленым месцы.

Як заўважаюць праваахоўнікі, большая частка ўказаных правапарушэнняў здзяйсняецца людзьмі, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення. Менавіта аматары спіртнога з'яўляюцца парушальнікамі правапарадку і на сушы.

— Для большасці нашых грамадзян дастаткова вуснай заўвагі, правядзення прафілактычнай гутаркі, — і пляцоўка алкаголю ў грамадскім месцы спыняецца, — кажа **міліцыянер роты патрульна-паставой службы міліцыі Цэнтральнага РУУС Мінска Ігар КРУГЛІКАЎ.** — У любым выпадку ўстанаўліваецца асоба правапарушальніка. Калі ён ніколі не прыцягваўся да адказнасці, выносіцца вуснае папярэджанне. Але ёсць і тыя, для каго словы супрацоўніка міліцыі абсалютна нічога не значаць. Такіх грамадзян затрымліваем, дастаўляем у органы ўнутраных спраў. Калі неабходна, для выцверажэння адпраўляем у ізалятар Першамайскага РУУС, прыцягваем да адміністрацыйнай адказнасці.

Некаторыя нядобрасумленныя грамадзяне спрабуюць хітрыць: наліваюць напоі з градусам у бутэлькі з сокам ці нават у тэрмас. Іншыя, калі бачаць людзей у пагонах, проста хаваюць спіртное. Аднак кампетэнтныя органы не падманеш. У дапамогу пешаму нараду міліцыі выстаўляецца адзін або два супрацоўнікі ў грамадзянскім адзенні. Міліцыянеры ходзяць па пляжы (па знешнім выглядзе нагадваюць звычайных адпачывальнікаў) і назіраюць, як сябе паводзяць людзі. Калі яны бачаць, што хтосьці, напрыклад, распівае тыя ж спіртныя напоі, то па радыёстанцыі перадаюць інфармацыю сваім калегам у форме. У працэсе разбору супрацоўнік у цывільным з'яўляецца сведкам правапарушэння, і пазбегнуць адказнасці людзям «пад мухай» ужо не атрымаецца.

### ПА АПОШНІМ СЛОВЕ ТЭХНІКІ

Разабрацца ў спрэчных сітуацыях, калі правапарушальнік адмаўляе сваю віну, стала прасцей, чым гэта было яшчэ год таму. Кожны з супрацоўнікаў міліцыі, які ажыццяўляе патруляванне тэрыторыі, экіпіраваны відэарэгістратарам: гэты зусім не вялікі прыбор фіксуе кожную размову праваахоўніка з грамадзянамі. Пры неабходнасці інфармацыя, запісаная на відэарэгістратар, перадаецца ў суд.

Дарэчы, сёлета, па ініцыятыве органаў унутраных спраў, ва ўсіх месцах масавага адпачынку ўстаноўлены сістэмы відэаназірання, якія стымулююць грамадзян на прыстойныя паводзіны,





а таксама дапамагаюць праваахоўнікам у раскрыцці злачынстваў, спыненні правапарушэнняў. Яшчэ адно ноу-хау, якое міліцыянерамі будзе актыўна прымяняцца пры забеспячэнні правапарадку ў месцах масавага адпачынку, — беспілотныя лятальныя апараты. У кожным рэгіёне вызначаны лакацыі, дзе плануюць выкарыстоўваць і такую тэхніку.

«Выкарыстанне беспілотнікаў будзе садзейнічаць больш аператыўнаму рэагаванню на правапарушэнні і злачынствы, — удакладняе Аляксандр Мухо. — У цяперашні час праводзіцца эксперымент. Калі яго вынікі будуць станоўчымі, беспілотныя лятальныя апараты стануць прымяняцца ва ўсіх райаддзелах нашай краіны: на найбольш буйных пляжах або тэрыторыях, якія цяжка прайсці пешшу або гэта зойме працяглы час».



### ДЗЕЛЯ МАБІЛЬНАСЦІ І АПЕРАТЫЎНАСЦІ

Пачынаючы з мінулага года, для выканання пэўных задач супрацоўнікамі органаў унутраных спраў стаў актыўна прымяняцца мота-, вела- і электратранспарт. Гэта і веласіпеды, і электрасамакаты, і сігвеі. Менавіта з дапамогай сігвеяў, якія, па новых Правілах дарожнага руху, з'яўляюцца сродкам персанальнай мабільнасці, супрацоўнікі міліцыі нясуць патруляванне ў парку Чалюскінцаў. У летні перыяд сталічны парк культуры і адпачынку лідзіруе па колькасці наведвальнікаў — адначасова тут праводзіць час некалькі тысяч чалавек.

Парк Чалюскінцаў з'яўляецца яшчэ не толькі самым папулярным для наведвання, але і самым вялікім па плошчы. Абысці яго ўздоўж і ўпоперак, каб праканталяваць правапарадак, патрэбен не адзін нарад міліцыі. Аднак дзякуючы электратранспарту, гэтае пытанне вырашаецца меншымі сіламі — у максімальна кароткія тэрміны на сігвеях міліцыянеры могуць дабрацца туды, дзе неабходная дапамога людзей у форме.

— Асвоіць электратранспарт было нескладана: з гэтым паспяхова справіліся ўсе супрацоўнікі падраздзялення, якое нясе службу ў парку, — заўважае **намеснік камандзіра роты па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Першамайскага РУУС Мінска старшы лейтэнант міліцыі Яўген ЧАРНОБЫЛЕЦ.** — Па парку міліцыянеры рухаюцца з хуткасцю пяць кіламетраў за гадзіну. Максімальная хуткасць, якую могуць развіваць сігвеі, — да 30 кіламетраў за гадзіну. Зараду хапае на ўсю змену. Новыя тэхналогіі зрабілі нашу службу лягчэйшай. Мы сталі больш мабільнымі, хутчэй дабіраемся да месца правапарушэння. Нарад абслугоўвае нашмат большую тэрыторыю, чым хлопцы хадзілі б пешшу. Гэта дае магчымасць выставіць людзей у іншае месца.

### ВЯРТАЮЦЬ РЭЧЫ І... ДЗЯЦЕЙ

Як адзначае **міліцыянер роты патрульна-паставой службы міліцыі Першамайскага РУУС Сяргей ХАРТАНОВІЧ,** нягледзячы на свой маштаб, парк Чалюскінцаў — месца некрымінагеннае. «Нават адміністрацыйныя правапарушэнні тут здзяйсняюцца вельмі рэдка, — канкрэтызуе ён. — Працуюць атракцыёны, арганізавана танцавальная пляцоўка — у парку бавяць час людзі ўсіх уз-

ростаў. Народ збіраецца, але мы кантралюем сітуацыю».

Па словах міліцыянера, асноўнае правапарушэнне, якое, хоць і зрэдку, але фіксуюць праваахоўнікі, — распіванне спіртных напояў. «Калі мы падыходзім і робім заўвагу, людзі просяць прабачэння, кажуць, што не ведалі, — удакладняе Сяргей Хартановіч. — Дарэчы, не ўсе ведаюць і аб тым, што ў парку Чалюскінцаў забаронены выгул сабак, нельга катацца на веласіпедах. Парк з'яўляецца свабоднай зонай ад курэння. Мы тлумачым людзям правілы, яны з разуменнем ставяцца да іх».

Здараецца, што грамадзяне пакідаюць на лаўках свае рэчы. Загаварыўшыся, забываюцца пра сумкі, тэлефоны, банкаўскія карткі, студэнцкія білеты. Дзякуючы ўзаемадзеянню міліцыі з супрацоўнікамі парку, уладальнікі забытых рэчаў хутка знаходзяцца.

— Што датычыцца крадзяжоў, то летась за ўвесь купальны сезон намі былі зафіксаваны толькі тры выпадкі па ўсёй краіне, — звяртае ўвагу Аляксандр Мухо. — Можна меркаваць, што свой плён дае прысутнасць у месцах масавага адпачынку супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, усюды размешчаны прафілактычныя лістоўкі. Рэгулярна праводзім з адпачывальнікамі гутаркі, каб яны не пакідалі на адкрытых месцах кашалькі, сумкі, іншыя каштоўныя рэчы. Акрамя таго, ходзім па паркоўках, правяраем, каб былі зачынены вокны, дзверы аўтамабіляў. Калі нешта адчынена, тэлефануем уладальніку аўто, чым таксама прадухіляем крадзяжы.

Рэгулярна да супрацоўнікаў міліцыі, якія дзяжураць у парку, звяртаюцца з пытаннямі, просьбамі. Мы сталі сведкамі таго, як жанчыны пыталіся ў праваахоўнікаў, як прайсці ў Цэнтральны батанічны сад. Звычайна цікавяцца, дзе метро, пляцоўка з атракцыёнамі, цэнтральная алея. Аднак бываюць і неардынарныя просьбы. Днямі, напрыклад, да нарада міліцыі, у склад якога ўваходзіў і Сяргей Хартановіч, звярнулася жанчына. Прасіла дапамагчы знайсці шасцігадовага сына, які згубіўся, пакуль яна ў касе набывала білеты на чарговы атракцыён.

— Жанчына паказала фотаздымак сына, зроблены тут жа, мы яго перазнялі і перадалі нашым калегам, якія дзяжурылі побач з паркам, — згадвае міліцыянер. — Да пошуку падключылася і моладзь на самакатах, і былыя пагранічнікі, якія адпачывалі ў парку. Адміністрацыя давала аб'яву аб згубленым дзіцяці па гучнай сувязі. Дапамагалі і супрацоўнікі метро, якія звярталі ўвагу на дзяцей, падобных на хлопчыка, якога мы шукалі. У выніку ён быў знойдзены праз некалькі гадзін недалёка ад парку. Як высветлілася, хлопчык быў з Расіі, у Мінск прыехаў другі раз. Выпусціўшы з віду маму, ён не ведаў, куды ісці. На шчасце, усё скончылася добра.

Дарэчы, найбольш смелыя юныя наведвальнікі парку Чалюскінцаў просяць у супрацоўнікаў міліцыі пакатацца на сігвеях — сведкамі гэтаму сталі і карэспандэнты газеты. Праваахоўнікі не адмаўляюць. Часта выкарыстоўваюць гэты час для правядзення прафілактычнай гутаркі: расказваюць малым лайфхакі, як не трапіць у бяду і не стаць правапарушальнікам. Тыя, у сваю чаргу, цікавяцца, дзе можна атрымаць прафесію міліцыянера, каб ужо праз некалькі гадоў, напрыклад, прыходзіць у гэты ж самы парк, але ўжо з іншай місіяй.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Прадметны дыялог

# Пра гісторыю і духоўнасць

## Член Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі пагутарыў са зняволенымі

**Дэпартамент выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў і Саюз пісьменнікаў Беларусі пачалі рэалізацыю сумеснай праграмы па арганізацыі культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў з удзелам асоб, якія ўтрымліваюцца ў папраўча-працоўных установах і лячэбна-працоўных прафілакторыях.**



«Зняволеныя — вельмі ўважлівая чытацкая аўдыторыя, — растлумачыў **член Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Анатоль МАТВІЕНКА** (у мінулым — следчы МУС, капітан міліцыі). — Калі я праводзіў з імі гутарку, звяртаў увагу ў першую чаргу на мужчын, якія з'яўляюцца рэцыдывістамі або асуджаны за найбольш цяжкія злачынствы. Заўважыў непадробную цікавасць іх да літаратуры».

Сустрэча пісьменніка з гэтай незвычайнай групай чытачоў адбылася ў анлайн-фармаце з мемарыяльнай залы Дома літаратараў у Мінску.

Як падкрэсліў Анатоль Матвіенка, кожнаму даецца шанц на выпраўленне. «Па прычыне акалічнасцяў і здзейсненых імі памылак яны трапілі ў адмысловыя ўмовы, — удакладніў пісьменнік. — Па іх тварах, якія ўдалося ўбачыць на экране, пераканаўся, што яны неабыякавыя да гісторыі і лёсу краіны. Адна толькі верагоднасць таго, што беларуская дзяржаўнасць значна больш старажытная, чым прынята лічыць, выклікала ў слухачоў шчыры эмацыянальны водгук. А нельга забываць, што большасць з іх хутка выйдзе на волю і, спадзяюся, ніколі не вернецца ў месцы зняволення. У нас з імі — агульная будучыня. Нам разам працягваць будаўніцтва агульнага дома — Беларусі. Калі дзякуючы гэтым гутаркам знізіцца колькасць рэцыдываў, час і сілы патрачаны не дарма».

Літаратар спыніўся на ролі Рускай праваслаўнай царквы ў распаўсюджванні пісьменства сярод усходніх славян і складаным павароце ў жыцці насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, калі мова карэннага народа была канфіскаваная з афіцыйнага абароту і з навучальных устаноў, а вернікаў прымушалі пераходзіць у грэка-каталіцтва. Узнімалася і пытанне кнігадрукавання. Асобна абмяркоўваўся ўплыў на нашай пісьмовай культуры на маскоўскую, уклад Сімяона Полацкага ў фарміраванне светапогляду рускай эліты ў канцы XVII стагоддзя.

«Са зняволенымі нельга размаўляць у павучальна-ментарскім тоне, — перакананы літаратар. — Кантакт магчымы толькі праз цікавасць. Таму я засяроджуся на займальных малавядомых фактах, але без так званай жаўцізны».

У завяршэнні гутаркі Анатоль Матвіенка коратка ахарактарызаваў стан сучаснай беларускай мастацкай літаратуры, якая абапіраецца на больш чым тысячагадовыя традыцыі славянскага пісьменства, і парэкамендаваў адміністрацыі ўстаноў Дэпартамента выканання пакаранняў актыўна закупляць для бібліятэк навінкі Выдавецкага дома «Звязда».

**Святлана ГУСАРАВА.**

Будзьце пільнымі!

# САКРЭТЫ БЯСПЕЧНАГА ДЗЯЦІНСТВА

## На што звяртаць увагу бацькам, каб іх дзеці не сталі парушальнікамі закону?

**Пытанне бяспекі дзяцей становіцца асабліва вострым у летні перыяд. Дарослым мала паклапаціцца аб стварэнні камфортных умоў для баўлення часу сваіх нашчадкаў, патлумачыць ім, у чым небяспечнасць непадкантрольнага знаходжання каля вадаёмаў і да чаго могуць прывесці гульні з агнём. Неабходна падумаць і аб прававым боку летняга адпачынку дзяцей. Злачынцы рэгулярна ўцягваюць у свае супрацьпраўныя дзеянні непаўналетніх: заманьваюць вялікімі заробкамі і іншымі выдуманымі дабротамі. Будучы найбольш неабароненай часткай грамадства, дзеці з лёгкасцю пагаджаюцца на шэрыя схемы, часта нават не ўсведамляючы таго, якімі наступствамі гэта можа абярнуцца.**

### ЛЁГКІ ЗАРОБАК — 10 ГАДОЎ ЗНЯВОЛЕННЯ

Як расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення па ахове правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый МЯЛЕШКА,** сярод падлеткаў пераважаюць такія злачынствы, як крадзяжы, хуліганства, незаконны абарот наркатычных сродкаў і махлярства. «Улічваючы, што ў цяперашні час непаўналетнія ў асноўным паглыблены ў інтэрнэт, гэта дазваляе правапарушальнікам выкарыстоўваць новыя формы і метады для ўцягнення дзяцей у супрацьпраўную дзейнасць», — звяртае ўвагу ён.

Адзін з новых відаў злачынстваў — продаж падлеткамі рэквізітаў банкаўскіх картак трэцяй асобе. Як гэта выглядае? Непаўналетні, якому не менш за 16 гадоў, адкрывае ў банку на сваё імя рахунак, затым знаходзіць у інтэрнэце трэцюю асобу, якая гатова набыць гэтую самую банкаўскую картку або рахунак. Прычым не заўсёды ёсць усведамленне таго, што рэалізацыя рэквізітаў банкаўскага рахунку з'яўляецца злачынствам. Такі від правапарушэння прадугледжвае пазбаўленне волі да 10 гадоў.

Пачасціліся і выпадкі здзяйснення непаўналетнімі махлярскіх дзеянняў на падставе фінансавай дапамогі сваяку, які быццам бы стаў віноўнікам дарожна-транспартнага здарэння. «У такі від злачынства падлеткаў уцягваюць у асноўным у якасці кур'ераў, — адзначае Дзмітрый Мялешка. — Арганізатар схемы звязваецца з падлеткам з дапамогай тэлеграм-канала і дае заданне для наведвання выбранай асобы ў якасці ахвяры. Падлетак прыязджае па ўказаным адрасе, забірае грошы і перадае іх свайму куратару. Гэты від злачыннай дзейнасці з'яўляецца махлярствам, здзейсненым арганізаванай групай, і прадугледжвае да 10 гадоў пазбаўлення волі».

Даўно не сакрэт, што некаторыя падлеткі кураць. Апошнім часам з гэтай мэтай стала модна выкарыстоўваць электронныя парагенератары. Аднак не ўсе могуць дазволіць сабе купіць гэтую даволі нятанную рэч. У выніку некаторыя ідуць на злачынства. Замаўляюць парагенератар у інтэрнэце, дамаўляюцца аб сустрэчы, затым выхопліваюць электронную цыгарэту з рук прадаўца і ўцякаюць. Пры гэтым многія падлеткі не задумваюцца, што за такое «свавольства» можна пазбавіцца волі.

### БЫЦЬ У КУРСЕ СПРАЎ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ

Непаўналетнія павінны ведаць і аб адказнасці за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. У пачатку года супрацоўнікамі міліцыі была спынена спроба незаконнай дзейнасці, запланаванай удзельнікамі маладзёжнага руху «Рэдан». Субкультура ўзнікла ў якасці перайманне японскай мультыплікацыі аб злачыннай групоўцы і адзначаецца магчымым удзелам яе прыхільнікаў у масавых бойках у гандлёвых цэнтрах. У адрозненне ад некаторых краін, беларускія праваахоўнікі своечасова адрэагавалі на спробу масавага збору і падобнага не дапусцілі.

«За ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах прадугледжана адміністрацыйная адказнасць, што цягне накладанне штрафу ў сто базавых велічынь, — звяртае ўвагу намеснік начальніка ўпраўлення па ахове правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама. — Калі ў адносінах да грамадзян была прыменена фізічная сіла або здзейснены пэўныя хуліганскія дзеянні — уступае ў сілу Крымінальны кодэкс».

Як адзначае Дзмітрый Мялешка, нярэдка правапарушэнні, ажыццёўленыя дзецьмі, адбываюцца ў кватэрах, якія непаўналетнія называюць флэтамі. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Нядаўна кампанія падлеткаў ад 11 да 13 гадоў сабралася ў адной з кватэр, дзе распівала спіртныя напоі. У выніку ўсе дзеці апынуліся ва ўстановах аховы здароўя з дыягназам «алкагольная інтаксікацыя».

Міліцыянеры рэкамендуюць нагадваць дзецям і аб правілах бяспекі на дарогах. Каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў, варта расказаць сваім нашчадкам, нават калі яны старэйшага школьнага ўзросту, як сябе паводзіць на праезднай часткі.

Яшчэ адзін важны момант, на які бацькам варта звярнуць увагу. Сёлета адзначаецца рост колькасці дзяцей, якія сталі ахвярамі сексуальнага гвалту. Праваахоўнікі рэкамендуюць дарослым не ігнараваць нават самыя малыя змяненні ў паводзінах сваіх дзяцей. Вы павінны ведаць, чым вашы дзеці займаюцца ў інтэрнэт-прасторы, з кім перапісваюцца, якія сайты наведваюць.

### НАРКОТЫКІ — ТАБУ!

Не страчвае актуальнасці і праблема, звязаная з прыцягненнем падлеткаў у незаконны абарот наркатычных сродкаў. У 2021 годзе толькі ў Мінску былі затрыманы 33 непаўналетнія. Імі здзейснены 33 злачынствы, 28 з якіх — збыт наркотыкаў цяжкіх і асабліва цяжкіх саставаў.

— Спажыўцамі наркотыкаў усё часцей становяцца сацыяльна адаптаваныя і дастаткова паспяховыя падлеткі, маладыя людзі з сем'яў з высокім узроўнем дастатку, — акцэнтуе ўвагу **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама Кірыл БЯРКОЗАЎ.** — Аднак прычыны наркаманіі ляжаць не толькі ў эканамічнай плоскасці. Садзейнічае ўцягненню ў незаконны абарот наркотыкаў так званы пераход ад дзяцінства да дарослацці, які суправаджаецца вялікай колькасцю вольнага часу, шматлікімі формамі яго правядзення (наведванне начных клубаў, дыскатэк). Уплываюць і тыя кампаніі, у якіх знаходзіцца непаўналетні. Ёсць толькі адзін спосаб пераадолець гэтую небяспеку — выхаваць у дзіцяці гатоўнасць у любы момант сказаць «не» любой прояве, звязанай з наркотыкамі.

Як адзначаюць праваахоўнікі, асноўным рэсурсам для распаўсюджвання наркотыкаў стаў інтэрнэт. Уцягваюцца непаўналетнія шляхам рассылання паведамленняў у шматлікіх месенджарах і сацыяльных сетках з прапановай аб уладкаванні на работу ў краму па раскладцы тавараў. Некаторыя інтэрнэт-крамы не ўтойваюць, што трэба будзе раскладваць забароненых тавар, іншыя завяраюць, што ўсё легальна. Непаўналетнія, як правіла, пагаджаюцца — ім абяцаюць немалыя грошы. На жаль, многія не ведаюць, што сярэдняя працягласць іх працаўладкавання — два-тры месяцы. Органы ўнутраных спраў хутка выходзяць на наркакур'ераў. Крымінальная адказнасць за незаконны абарот наркотыкаў наступае з 14 гадоў. Санкцыі артыкула прадугледжваюць да 25 гадоў пазбаўлення волі.

Па словах Кірыла Бяркозава, інтэрнэт і гаджэты не толькі садзейнічаюць развіццю дзіцяці, але і нясуць сур'ёзную пагрозу яго бяспецы. «Спрабуючы не парушыць асабістую прастору падлетка, не звяртаючы ўвагу на тое, з кім ён мае зносіны ў сацсетках, не ўнікаючы ў лад жыцця, тата і мама, на жаль, даведваюцца аб наступствах вельмі позна, — канстатуе ён. — Гэта не азначае, што дарослым трэба поўнасцю пазбавіць дзіця інтэрнэту (наўрад ці гэта атрымаецца). Варта знайсці час на элементарныя размовы з непаўналетнім, у ходзе якіх трэба звярнуць увагу на тое, з кім ён мае зносіны ў сацсетках, якія сайты наведвае. Найлепшае вырашэнне праблемы — яе папярэджанне. Таму не шкадуйце ўвагі на сваіх дзяцей! Калі яны будуць уцягнуты ў незаконны абарот наркотыкаў, спатрэбіцца нашмат больш часу, каб гэтую праблему вырашыць».

Такім чынам, у першую чаргу адказнасць за дзяцей нясуць іх бацькі. Як вы падрыхтуеце іх да лета, арганізуеце занятасць і правядзеце з імі дадатковую прафілактычную работу, будзе залежыць, ці паспяхова пройдуць канікулы і ці застануцца ў памяці толькі добрыя ўспаміны.

**Вераніка КАНЮТА.**

Права на адпачынак

# ЗА МЯЖУ З БАЦЬКАМІ І БЕЗ ІХ

## Дзіця можа выехаць, калі ёсць згода на аздараўленне

**Лета — спрыяльны час, каб звазіць дзіця на канікулах адпачыць і аздаравіцца за мяжу. Аднак калі паміж бацькамі няма згоды ў гэтым пытанні, прыйдзецца дзейнічаць праз суд, каб атрымаць згоду на аздараўленне ці іншы дакумент, дзе ўказана прычына, па якой дастаткова дазволу толькі аднаго з бацькоў. Як правільна дзейнічаць, каб малы змог адпачыць летам за мяжой (адзін ці з кімсьці з бацькоў або законных прадстаўнікоў), расказала Святлана ТОКАРАВА, натарыус Гомельскай натарыяльнай акругі.**



### КАЛІ АДЗІН СУПРАЦЬ — ДРУГОМУ ТРЭБА ІСЦІ Ў СУД

Непаўналетнія беларусы могуць выязджаць з краіны па сваіх пашпартах — гэта вынікае з Закона «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь». Перасячы граніцу дзеці могуць у суправаджэнні аднаго ці абодвух бацькоў або іншых законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні імі супрацоўніку органа пагранічнай службы ці мытнага органа дакументаў, якія пацвярджаюць статус законных прадстаўнікоў непаўналетняга, расказала Святлана Токарава:

*— Калі з малым выязджае адзін з законных прадстаўнікоў, ён таксама павінен прад'явіць работнікам адпаведных арганізацый дакумент, які пацвярджае яго статус у дачыненні да непаўналетняга. Дзіця, якое едзе без суправаджэння законных прадстаўнікоў, павінна прад'явіць супрацоўнікам мытнай ці пагранічнай службы пісьмовую згоду абодвух сваіх бацькоў ці законных прадстаўнікоў на выезд за мяжу. Калі ёсць асоба, якая суправаджае непаўналетняга, яна можа прад'явіць згоды бацькоў замест непаўналетняга.*

На жаль, здараецца, што ў сям'і меркаванні бацькоў адносна выхавання і аздараўлення дзіцяці разыходзяцца. Тады той з бацькоў, які не згодны з парадкам выезду дзіцяці за мяжу, мае права звярнуцца ў суд і вызначыць іншы парадак выезду. У гэтым выпадку інфармацыя суда аб вызначэнні іншага парадку выезду непаўналетняга за мяжу ўключаецца ў банк даных аб грамадзянах, права на выезд якіх з краіны абмежавана, удакладніла натарыус:

*— Як паказвае практыка, пасля скасавання шлюбу бацькі спрабуюць маніпуляваць адно адным, адмаўляючыся даць згоду на выезд дзіцяці за мяжу для аздараўлення. Або адзін з бацькоў можа знаходзіцца ў вышуку. У гэтым выпадку закон аб выездзе і ўездзе ў Беларусь дазваляе непаўналетнім перасякаць мяжу ў складзе агульных або спецыяльных арганізаваных груп дзяцей, якія выязджаюць з краіны на аздараўленне, з пісьмовай згоды толькі аднаго з бацькоў.*

Калі за мяжу дзіця збіраецца з некім са сваякоў, а адзін з бацькоў адсутнічае, адмаўляе ў згодзе або яго згоду атрымаць немагчыма, другі з сужэнцаў мае права звярнуцца ў суд. У такім выпадку для перасячэння мяжы замест згоды аднаго з бацькоў будзе дастаткова прад'явіць адну з наступных копій рашэння суда:

аб магчымасці выезду дзіцяці з краіны без згоды другога законнага прадстаўніка;

аб прызнанні другога законнага прадстаўніка асобай, якая адсутнічае без вестак;

аб абвяшчэнні другога законнага прадстаўніка памерлым;

аб пазбаўленні другога законнага прадстаўніка бацькоўскіх правоў;

аб прызнанні другога законнага прадстаўніка недзеяздольным.

Калі адзін з бацькоў знаходзіцца ў вышуку, яго згоду замяняе даведка аб знаходжанні ў вышуку, якую выдае орган, што вядзе крымінальны працэс.

*— Для перасячэння мяжы без суправаджэння бацькоў непаўналетнія могуць прад'явіць таксама наступныя дакументы: шлюбны дагавор або Пагадненне аб дзецях (ці іх копіі), дзе прадугледжана магчымасць выезду з Беларусі непаўналетняга без згоды другога законнага прадстаўніка, пасведчанне аб смерці (або яго копію) другога законнага прадстаўніка, даведку ЗАГСа (або яе копію) аб тым, што запіс аб бацьку дзіцяці зроблены на падставе заявы маці, якая не па́біралася шлюбам,* — удакладніла спецыяліст.

### СВЕДЧЫЦЬ — НЕАБХОДНА! ЛАМІНІРАВАЦЬ — НЕЛЬГА!

Згода на часовы выезд дзіцяці ў канкрэтную краіну на дакладны перыяд часу павінна быць засведчана ў натарыуса. Тэкст такіх згод або ключавыя фразы, якія мусяць утрымлівацца ў тэксце згоды, як правіла, прапануе фонд ці арганізацыя, якія займаюцца выездам. Акрамя таго, пасольствы некаторых еўрапейскіх краін хочуць бачыць у прад'яўляльных згодах нейкія дакладныя фармулёўкі, таму задача бацькоў — даць натарыусу такую інфармацыю для ўключэння яе ў тэкст дакумента, акрэсліла Святлана Токарава:

*— Здараецца, бацькі звяртаюцца да натарыуса па сведчанне згоды на выезд непаўналетняга за межы Беларусі, аднак нават не ведаюць, куды вязуць іх дзіця. Яны лічаць дастатковым клопатам проста аддаць у школу дакумент, які патрабуецца. На шчасце, такіх бацькоў няшмат.*

Пры сведчанні згоды законных прадстаўнікоў непаўналетняга на выезд дзіцяці за мяжу натарыус павінен праверыць дакументы, якія пацвярджаюць сваяцкія адносіны ці сведчаць апеку (папячыцельства). Пералік такіх дакументаў утрымліваецца ў інструкцыі аб парадку здзяйснення натарыяльных дзеянняў. Найбольш дакладныя звесткі аб бацьках і даце нараджэння малога ўтрымліваюцца ў пасведчанні аб нараджэнні дзіцяці. Калі прозвішча аднаго з бацькоў змянілася, неабходна таксама прад'явіць адпаведныя дакументы.



Можна сведчыць і згоды на часовыя выезды дзіцяці ва ўсе краіны свету, у тым ліку ў краіны Шэнгенскага пагаднення з любой мэтай паездкі да дасягнення малым васямнаццацігадовага ўзросту. Паколькі згода прад'яўляецца пагранічным пастам і мытным органам толькі для прагляду, дакумент застаецца ў дзіцяці ці асобы, якая яго суправаджае, і можа выкарыстоўвацца неаднаразова (калі да паўналецця дзіцяці не змяніцца заканадаўства), удакладніла натарыус:

*— Ламініраваць дакумент не варта. Бывалі выпадкі, калі бацькам прыходзілася звяртацца па сведчанне новай згоды паўторна, бо дзіцяці адмаўлялі ў пропуску праз пагранпост па такім заламініраваным дакуменце. Натарыяльны тарыф за сведчанне згоды не залежыць ад тэрміну дзеяння дакумента і складае 50 % базавай велічыні.*

Ад аплаты натарыяльнага тарыфу за сведчанне згоды вызваляюцца законныя прадстаўнікі непаўналетніх беларусаў, якія з'яўляюцца дзецьмі-сіротамі ці малымі, якія засталіся без апекавання бацькоў і знаходзяцца ў дамах дзіцяці; сацыяльна-педагагічных установах; школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без папячыцельства бацькоў; дапаможных школах-інтэрнатах; спецыяльных агульнаадукацыйных установах; спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах і іншых установах, якія забяспечваюць умовы для пражывання і ўтрымання дзяцей. А таксама ва ўстановах, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх ці прыёмных сем'ях.

Сёння згода афармляецца не менш як у двух экзэмплярах і не можа перавышаць колькасць асоб, ад якіх яна сведчыцца. Адзін з экзэмпляраў згоды захоўваецца ў справах натарыуса. Калі арыгінал згоды згублены і немагчыма засведчыць аналагічны дакумент, можна звярнуцца да натарыуса для атрымання дубліката згоды.

**Ірына СІДАРОК.**

Класныя навіны

# «ШКОЛА КІРАВАННЯ» — ТРАМПЛІН ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

**Міністэрствам адукацыі ўстаноўлены парадак адбору адзінаццацікласнікаў на праграму дадатковай адукацыі ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**



Зацверджаная інструкцыя вызначае парадак правядзення праверкі здольнасцяў для прыёму (залічэння) асоб у Акадэмію кіравання для асваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Школа кіравання».

Праверка накіравана на выяўленне здольнасцяў і матывацыі адзінаццацікласнікаў. Яна праводзіцца ў два этапы: завочны (дыстанцыйны) і вочны (будзе праходзіць на базе Акадэміі кіравання). Да праверкі дапускаюцца асобы з ліку навучэнцаў 11-х класаў, якія асвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

Каб прыняць удзел у праверцы, тыя, хто паступае, або законныя прадстаўнікі тых непаўналетніх асоб, якія паступаюць, павінны накіраваць на паштовы адрас Акадэміі кіравання заяўку з анкетнымі данымі, рэкамендацыю з месца вучобы і рэкамендацыю мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або ўпаўнаважанага ім структурнага падраздзялення. Яшчэ адзін важны пункт — напісанае эсэ па тэмах, якія вызначаюцца Акадэміяй кіравання.

Да праходжання другога этапу дапускаюцца асобы, якія паспяхова прайшлі першы этап праверкі. На другім этапе абітурыенты выконваюць тэставыя заданні на вызначэнне ўзроўню падрыхтаванасці для асваення зместу адукацыйнай праграмы.

Акадэмія кіравання вызначае тэрміны правядзення праверкі, тэмы эсэ, патрабаванні да зместу эсэ, крытэрыі яго ацэньвання і размяшчае адпаведную інфармацыю на сваім афіцыйным сайце не пазней чым за месяц да пачатку правядзення праверкі.

Выпускнікі, якія паспяхова асвоілі праграму «Школы кіравання», змогуць прэтэндаваць на паступленне ў Акадэмію кіравання ў 2024 годзе без уступных іспытаў.

Нагадаем, што ўступная кампанія праходзіць сёлета па абноўленых правілах. У прыватнасці, для абітурыентаў у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь была ўведзена абавязковая прафесійна-псіхалагічная гутарка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Маладыя лагісты папоўнілі рады БРСМ

**У Мінску ў галаўным офісе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белмытсэрвіс» прайшла ўрачыстая цырымонія ўручэння маладзёжных білетаў БРСМ маладым спецыялістам Нацыянальнага лагістычнага аператара Беларусі.**

Шэрагі галіновага камітэта БРСМ, які быў створаны 21 красавіка і аб'ядноўвае больш за паўтысячы маладых лагістаў, сімвалічна папоўнілі 24 маладыя спецыялісты прадпрыемства, якія гэтымі днямі адзначаюць сваё 24-годдзе.

РУП «Белмытсэрвіс» заснавана Дзяржаўным мытным камітэтам Беларусі ў 1999 годзе. Развіваючы беларускую і міжнародную лагістыку, Нацыянальны 4PL-аператар не толькі займае лідарскія пазіцыі на рынку знешнеэканамічнай дзейнасці, але і робіць свой уклад у падтрыманне эканамічнай бяспекі Беларусі.

У Год міру і стваральнай працы моладзь лагістычнай кампаніі выйшла з ініцыятывай закласці патрыятычную традыцыю галіновага камітэта — кожнаму новаму члену арганізацыі разам з маладзёжным білетам і значком арганізацыі ўручаць Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

Падчас імпрэз была прэзентавана дзейнасць галіновага камітэта БРСМ і ўручаны ўзнагароды найлепшым працаўнікам прадпрыемства.

Для яго ўдзельнікаў былі арганізаваны выстаўкі работ пераможцаў рэспубліканскага патрыятычнага конкурсу малюнкаў «Хатынь вачыма дзяцей» і ўдзельнікаў дзіцячага арт-фестывалю «Белмытсэрвіс» «Мая Беларусь. За мір і стварэнне».

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Весткі з Кітая




# ШАНХАЙСКІМ ШЛЯХАМ

## Чым адметная ШАС?

**Гісторыя Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва налічвае 22 гады. Сёння гэта насамрэч адна з найбуйнейшых сусветных платформ узаемадзеяння. Пра стварэнне ШАС было абвешчана 15 чэрвеня 2001 года ў Шанхаі Казахстанам, Кыргызстанам, Кітаем, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін (акрамя заснавальнікаў, гэта Індыя і Пакістан, якія таксама далучыліся ў 2017-м) з агульным насельніцтвам больш за тры мільярды чалавек, што фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. У Беларусі, Афганістана, Ірана і Манголіі — статус дзяржаў-назіральнікаў. Акрамя таго, Азербайджан, Арменія, Егіпет, Камбоджа, Катар, Непал, Саудаўская Аравія, Турцыя і Шры-Ланка — партнёры па дыялогу. Завяршаецца работа па афармленні дыялогавага партнёрства з Бахрэйнам, Кувейтам, Мальдывамі, М'янмай і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. Пры гэтым колькасць заявак ад розных краін на далучэнне да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва павялічваецца. Чым жа адметная ШАС? Каб даведацца аб гэтым на ўласныя вочы, журналісты з больш чым 20 краін (*сярод якіх — карэспандэнт «Звязды»*) накіраваліся ў Кітай.**

### ВЯЛІЗНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Дзяржавы, якія ўзаемадзейнічаюць на платформе ШАС, адрозніваюцца сацыяльнымі сістэмамі, шляхам развіцця, гісторыяй і разнастайнай культурай. «Але ўсе мы — члены «сям'і ШАС». Выступаем за «шанхайскі дух», а менавіта «ўзаемны давер, узаемную выгаду, роўнасць, кансультацыі, павагу да розных цывілізацый і імкненне да агульнага развіцця», — заўважыў кітайскі нацыянальны каардынатар ШАС Чжан Хайчжоў падчас сустрэчы з масмедыя ў Міністэрстве замежных спраў Кітая.

Павышэнне якасці жыцця людзей — агульнае імкненне краін арганізацыі. Як адзначыў кітайскі дыпламат, дзяржавы актыўна прасоўваюць рэгіянальную эканамічную інтэграцыю ў рэгіёне, стварылі механізмы нарад кампетэнтных ведамстваў па эканоміцы, гандлі, сельскай гаспадарцы і транспарце, склалі і рэалізоўваюць шэраг дакументаў, у тым ліку Праграму шматбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, Пагадненне аб стварэнні спрыяльных умоў для міжнародных аўтамабільных перавозак. Створаны Міжбанкаўскае аб'яднанне і Дзелавы савет. Тым самым надаецца ўстойлівы імпульс развіццю эканомікі і паляпшэнню дабрабыту народаў.

У мінулым годзе агульны аб'ём тавараабароту паміж Кітаем і дзяржавамі — членамі ШАС дасягнуў 411,8 мільярда долараў. У параўнанні з 2021-м прырост склаў 20 працэнтаў. «Адметна, што такія значныя дасягненні адзначаліся на фоне негатыўнай тэндэнцыі развіцця сусветнай эканомікі пасля пандэміі. Гэта сведчыць аб вялізным патэнцыяле супрацоўніцтва ў рамках ШАС», — падкрэсліў Чжан Хайчжоў.

Гарантаванне бяспекі — прыярытэтны кірунак супрацоўніцтва. Падпісана Канвенцыя ШАС па процідзеянні экстрэмізму, краіны бесперапынна ўмацоўваюць юрыдычную аснову супрацоўніцтва, нарошчваюць намаганні да развіцці такіх механізмаў, як рэгіянальная антытэрарыстычная структура і нарады кампетэнтных ведамстваў на розных узроўнях.

Як адзначыў Чжан Хайчжоў, павялічыўся ўзровень згуртаванасці і палітычнага ўзаемадаверу. «Краіны паважаюць найважнейшыя інтарэсы адзін аднаго, устанавілі канструктыўныя партнёрскія адносіны на аснове прынцыпаў недалучэння, неканфрантацыі і ненакіраванасці супраць трэцяга боку».

У 2010 года наша краіна з'явілася партнёрам па дыялогу, а з 2015-га мае статус афіцыйнага назіральніка ШАС. Рашэнне аб пачатку працэдуры прыёму Беларусі ў арганізацыю аднагалосна было прынята на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе ў верасні мінулага года. «Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва ператвараецца з рэгіянальнай арганізацыі ў глабальную. І самае галоўнае цяпер — не ўпусціць гэты момант. Трэба даць шанц тым дзяржавам (іх нямала) для таго, каб яны маглі знайсці альтэрнатыву існуючым рэаліям. Наша арганізацыя можа стаць глабальнай. Аб'ектыўна стаць. І вырашаць глабальныя праблемы светаўладкавання ў сучасных умовах. Трэба не спазніцца, злавіць гэты момант і адэкватна на гэта адказаць», — адзначыў у сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Кітайскі бок адразу падтрымаў ініцыятыву Беларусі аб паскарэнні працэдуры ўступлення ў ШАС. Аб гэтым паведаміў «Звяздзе» Чжан Хайчжоў. «Цяпер працэдура фактычна завершана. Чакаецца, што афіцыйна аб наданні Беларусі статусу краіны — члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва будзе абвешчана на сёлетнім форуме ў Нью-Дэлі, — заўважыў кітайскі нацыянальны каардынатар ШАС. — Цяпер актыўна вядзецца яго падрыхтоўка. У маі ў Гоа прайшла сустрэча міністраў замежных спраў краін — членаў ШАС, дзе абмяркоўвалася гэтае пытанне».

### НА ЎЗБЯРЭЖЖЫ ЖОЎТАГА МОРА

Ад Пекіна да Ляньюньгана каля 750 кіламетраў. Па беларускіх мерках адлегласць значная, па кітайскіх — некалькі гадзін руху. Гэта калі перамяшчацца на хуткасных цягніках, якія разганяюцца да 300 кіламетраў за гадзіну і больш. Сетка такой сучаснай чыгуначнай інфраструктуры ў Паднябеснай даволі разгалінаваная, таму дабрацца да ўзбярэжжа Жоўтага мора з кітайскай сталіцы можна без праблем. Так што пекінскую лакацыю мы хутка змянілі на партовую, ляньюньганскую.

Ляньюньган знаходзіцца ў правінцыі Цзянсу на ўсходзе Кітая. Як адзначаюць гіды, ён з'яўляецца ўсходнім фортам новага азіяцка-еўрапейскага трансканцінентальнага моста, адным з першых у краіне прыбярэжных гарадоў, адкрытых знешняму свету. Ляньюньган славіцца доўгай гісторыяй і багатай культурнай спадчынай. Тут былі выяўлены сляды дзейнасці людзей яшчэ ў эпоху позняга палеаліту. Кажуць, у свой час Канфуцый наведаў гэты горад, філосаф падымаўся на тутэйшую гару і любаваўся морам. Першы імператар Цынь Шыхуан (259—210 гг. да н. э.) падчас сваёй інспекцыі ва ўсходняй частцы Кітая прыехаў сюды і ўсталяваў камень у якасці ўсходняй брамы імперыі Цынь, а ў часы дынастый Хань і Тан Ляньюньган стаў адным з адпраўных пунктаў Марскога Шаўковага шляху.

Горад знаходзіцца ў стратэгічна важным месцы, дзе злучаюцца ўсход і захад, поўнач і поўдзень. На поўначы ад Ляньюньгана размешчаны Бахайскі заліў, на поўдні ад яго — дэльта ракі Янцзы, на ўсходзе — Жоўтае мора, а на захадзе — Новы азіяцка-еўрапейскі трансканцінентальны мост. Ляньюньган уваходзіць у лік 42 комплексных транспартных вузлоў Кітая з трохмернай транспартнай сістэмай і мультымадальнай перавозкай. Тут функцыянуюць порт, аўтадарогі, чыгункі, паветраны і рачны транспарт.

У падтрымку ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» у красавіку 2015-га ў Ляньюньгане пачалі будаўніцтва Міжнароднага лагістычнага парка ШАС (Ляньюньган) плошчай каля 70 кв. км. Тут сабралася больш чым 1600 прадпрыемстваў. У парку асноўным сфарміравалася мультымадальная лагістычная сістэма, якая ахоплівае аўтамабільны, чыгуначны, рачны і марскі транспарт, дзякуючы чаму аб'ект стаў комплексным. Вынік адпаведны: даход ад асноўнай дзейнасці лагістычных кампаній узрос з 250 мільёнаў юаняў напрыканцы 2018 года да больш чым 6,3 млрд юаняў летась. Паток тавараў за гэты час павялічыўся з 14,6 млн да 64,9 млн тон.



Рэгіён актыўна супрацоўнічае з Беларуссю. Ляньюньган устанавіў пабрацімскія сувязі з Жлобінскім і Крычаўскім раёнамі, а таксама з Магілёвам. Як паведаміў «Звяздзе» намеснік кіраўніка канцылярыі па замежных справах Ляньюньгана Лю Пэнда, рэалізоўваецца шэраг адметных праектаў, у прыватнасці па распрацоўцы лясных рэсурсаў, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, вырошчванні грыбоў. Па меркаванні прадстаўніка гарадской адміністрацыі, ёсць усе перадумовы для таго, каб надалей прадуктыўнае супрацоўніцтва пашыралася.

### ЦЭНТРАЛЬНЫ ХАБ

Далей — на захад — у Сіань, сталіцу правінцыі Шэньсі. Адлегласць паміж гарадамі — звыш тысячы кіламетраў. Аднак зноў-такі выручаюць хуткасныя цягнікі, дарога не заняла шмат часу. Мы фактычна рухаліся па старажытным Шаўковым шляху, які цяпер адрадзіўся ў выглядзе найбуйнейшай сучаснай транснацыянальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Горад існуе больш чым 3100 гадоў, некаторы час з'яўляўся самым буйным (як па плошчы, так і па колькасці жыхароў) горадам свету. Сіань быў сталіцай 13 дзяржаў у гісторыі Паднябеснай: у прыватнасці ў перыяды Чжоў, Цынь, Хань, Суй і Тан (сталіцы гэтых дзяржаў размяшчаліся звычайна ў розных месцах на невялікай адлегласці ад цэнтра сучаснага Сіаня). Старая назва горада — Чан'ань. Ён быў месцам прызначэння гандлёвых караванаў, якія ішлі па Вялікім Шаўковым шляху ў Кітай. У ваколлях горада размешчаны курганныя грабніцы Старажытнага Кітая, уключаючы маўзалей Цінь Шыхуандзі з тэракотавай арміяй.

Цяпер Шэньсі знаходзіцца ў цэнтры краіны, з'яўляецца важным хабам «Аднаго пояса, аднаго шляху». Шэсць з дзесяці комплексных транспартных калідораў праходзяць праз правінцыю. Сёлета пасажырапаток міжнароднага аэрапорта «Сіань-Сяньян» заняў пятае месца ў Кітаі. Непадалёк ад Сіаня знаходзіцца Янлін, дзе існуе дэманстрацыйная зона ШАС сельскагаспадарчай высокатэхналагічнай прамысловасці. Тут створаны 123 даследчыя і інавацыйныя платформы на ўзроўні правінцыі і міністэрстваў. Нездарма Янлін вядомы як «горад сельскагаспадарчай навукі Кітая».

Сёлета ён быў абраны месцам правядзення Форуму ШАС па скарачэнні беднасці і ўстойлівым развіцці. Як адзначыў генеральны сакратар ШАС Чжан Мін, дзяржавы, якія ўзаемадзейнічаюць на платформе арганізацыі, «падзяляюць агульнае разуменне і выступаюць за арыентаваную на народ філасофію развіцця, паглыбляюць супрацоўніцтва па павышэнні дабрабыту і ўзроўні жыцця людзей на прасторы ШАС». Чжан Мін заявіў аб неабходнасці прадаўжэння развіцця кааперацыі ў аграпрамысловай галіне і яе мадэрнізацыі. На яго думку, толькі навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва можа выдатна рэалізаваць сельскагаспадарчыя магчымасці, якія ёсць у краінах, і ператварыць вялікі патэнцыял у вытворчую сілу, што прыносіць карысць усяму свету.

Нізкі ўзровень жыцця насельніцтва раней быў характэрны для кітайскай глыбінкі. У шэрагу выпадкаў адзначалася крайняя беднасць. Каб пазбегнуць сацыяльных дыспрапорцый, палепшыць дабрабыт мясцовых жыхароў, у Кітаі ў сціслыя тэрміны была рэалізавана маштабная дзяржаўная праграма. У выніку ўдалося вывесці з беднасці сотні мільёнаў кітайцаў.

У Яньане, што ў правінцыі Шэньсі, рэалізавалі шэраг адметных праектаў з улікам рэгіянальных умоў. Між іншым, гэта знакавае месца ў Паднябеснай, радзіма кітайскай рэвалюцыі. Мясцовыя яблыкі сталі сусветна вядомым брэндам, смачная садавіна неаднойчы пабывала ў космасе. З 2015-га да 2020 года ў Яньане ў спецыяльныя фонды па барацьбе з беднасцю было інвеставана звыш 7,7 мільярда юаняў. Выдадзена каля мільярда юаняў мікракрэдытаў. У глыбінцы пабудавалі каля 2 тысяч кіламетраў асфальтавых і цэментных дарог. Амаль 50 тысяч чалавек палепшылі жыллёвыя ўмовы — пераехалі ў камфортнае жыллё з усімі выгодамі. Фінансавай падтрымкай скарысталіся 154,6 тысячы мясцовых жыхароў.

Як распавёў «Звяздзе» дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Уладзіслаў Прасвіракоў (цяпер у адпаведнасці з беларуска-кітайскім міжурадавым пагадненнем ён праходзіць пашыраную гадавую стажыроўку ў Паўночна-Заходнім універсітэце сельскай і лясной гаспадаркі ў горадзе Янліне), у Паднябеснай актыўна падтрымліваюць фермераў. Сельгасвытворцам выдзяляюцца разнастайныя дзяржаўныя прэферэнцыі. Як заўважыў эксперт, меры па развіцці сельскіх тэрыторый у Кітаі шмат у чым сугучныя мерапрыемствам дзяржпраграм адраджэння вёскі, якія паспяхова рэалізаваны ў Беларусі. Так што нашым краінам ёсць чаму павучыцца адна ў адной.

### НОВЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Апошні пункт нашага шматтысячнакіламетровага маршруту — Урумчы, цэнтр Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна (Паўночна-Заходні Кітай). Дасюль з Яньаня каля 2,5 тысячы кіламетраў. Гэтую адлегласць варта пераадолець, каб пабачыць унікальныя па ландшафце і прыгажосці мясціны. Да таго ж Урумчы — важны транспартны хаб на шляху Кітай — Еўропа. Паводле даных мытні горада, са студзеня да красавіка гэтага года аб'ём знешняга гандлю Сіньцзяна склаў каля 95 млрд юаняў, што на 82,7 працэнта больш, чым за такі ж час летась. З улікам мясцовых кліматычных умоў — засухі, высокай інтэнсіўнасці сонечнага выпраменьвання і моцнага ветру — тут паспяхова здзяйсняюць пераход да «зялёнага» развіцця шляхам аптымізацыі энергетычнай структуры і развіцця адпаведных галін. Сёлета за першы квартал аб'ём інвестыцый у ветраэлектрычныя і фотаэлектрычныя праекты павялічыўся больш чым удвая.

Уступленне Беларусі ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена дазволіць нашай краіне стаць мацнейшай, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. «Уступленне Беларусі ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена адкрывае новыя перспектывы. Гэтая арганізацыя цяпер з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце рэгіянальных аб'яднанняў. З ім мы самі станем мацнейшымі і зробім яго больш моцным, падаўшы дадатковыя магчымасці для супрацоўніцтва па многіх кірунках, уключаючы вытворчую кааперацыю і лагістыку, і працягнуўшы Шаўковы шлях», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Мінск — Пекін — Ляньюньган — Сіань — Янлін — Яньань — Урумчы — Мінск.*

# НА ШЛЯХУ ДА ЛІЧБАВАГА СУВЕРЭНІТЭТУ

**У Маскве адбыўся Тэхналагічны дзень, прысвечаны навукаёмістаму праграмнаму забеспячэнню (ПЗ) «НК «Раснафта». У мерапрыемстве ўзяло ўдзел больш за сто прадстаўнікоў найбуйнейшых нафтагазавых кампаній. Галоўныя інжынеры і кіраўнікі ІТ-праектаў навукова-даследчага інстытута «РН-БашНДПІнафта» прадэманстравалі магчымасці і планы развіцця навукаёмістага софту «Раснафты».**



«Раснафта» — першая кампанія ў Расіі, якая паспяхова стварае навукаёмістае праграмнае забеспячэнне, што ахоплівае ўсе ключавыя працэсы нафтагаздабычы. Лінейка навукаёмістага ПЗ сёння ўключае 23 праграмныя прадукты, дзесяць з якіх ужо выведзены на рынак і паспяхова прадаюцца. ІТ-рашэнні «Раснафты» прымяняюцца для вытворчых задач у галіне геалогіі, праектавання, распрацоўкі і эксплуатацыі радовішчаў. Яны пераўзыходзяць імпартныя аналагі па хуткасці, пераліку вырашаемых задач, прымяненню сучасных алгарытмаў і зразумеламу, зручнаму інтэрфейсу.

У рамках рэалізацыі інавацыйнай праграмы спецыялісты «Раснафты» распрацавалі першы ў Еўразіі прамысловы сімулятар гідраразрыву пласта (ГРП) «РН-ГРІД». Імпартазамяшчальная распрацоўка забяспечвае тэхналагічную незалежнасць кампаніі ў галіне камп'ютарнага мадэлявання, абавязковага для прымянення тэхналогіі ГРП. Па стане на пачатак 2023 года рэалізавана больш за 600 камерцыйных ліцэнзій на выкарыстанне праграмнага комплексу, заключаны дагавор аб пастаўцы «РН-ГРІД» у Кітай.

«Раснафта» заявіла аб планах вывaду сёлета на знешні рынак новых праграмных комплексаў — «РН-ВЕГА» і «РН-Буравыя разлікі».

У «РН-ВЕГА» ажыццяўляецца ўвесь працэс інтэрпрэтацыі гідрадынамічных даследаванняў свідравін (ГДДС), ад падрыхтоўкі «сырых» даных да выдачы вываду. Інтэрпрэтацыя ГДДС — навукаёмістая задача, якая патрабуе перадавых напрацовак у галіне матэматычнага мадэлявання пластавых сістэм. З дапамогай комплексу «РН-ВЕГА» спецыялісты могуць выконваць усе этапы аналізу ГДДС, у тым ліку вызначаць найважнейшыя ўласцівасці пласта, напрыклад пластавы ціск і пранікальнасць.

Да пераваг ПЗ адносяцца высокія хуткасць і дакладнасць матэматычнага ядра, падтрымка ўсіх відаў ГДДС. Цяпер праграмны комплекс праходзіць укараненне ў шасці даччыных прадпрыемствах «Раснафты». Больш за 200 карыстальнікаў штогод выконваe ў «РН-ВЕГА» больш як 3000 інтэрпрэтацый.

ПЗ «РН-Буравыя разлікі» прызначана для праектавання і будаўніцтва свідравін. Софт дазваляе планаваць траекторыі свідравін, аналізаваць рызыкі іх перасячэння, разлічваць устойлівасць свідравальнай калоны. Функцыянал ПЗ уключае таксама гідраўлічныя разлікі, прагназаванне вынасу свідравіннага шламу, праектаванне працэсаў мацавання і аўтаматызаванае стварэнне спраўздачнай дакументацыі.

Пры распрацоўцы праграмнага комплексу інстытутам выкарыстаны самыя сучасныя матэматычныя мадэлі і метады, якія прымяняюцца для праектавання і будаўніцтва свідравін. Распрацоўка інтэгруецца з іншымі лічбавымі прадуктамі кампаніі, дзякуючы чаму спецыялісты могуць ажыццяўляць поўны цыкл работ, выкарыстоўваючы выключна карпаратыўнае праграмнае забеспячэнне.

ПЗ «Раснафты» здольнае працаваць у айчынных аперацыйных сістэмах (АС) сям'і Linux.

Восем праграмных комплексаў уключаны ў Адзіны рэестр расійскіх праграм для электронных вылічальных машын і баз даных. Гэта пацвярджае адпаведнасць карпаратыўнага софту стандартам Мінлічбы РФ і робіць яго даступным для набыцця дзяржаўнымі органамі і кампаніямі з дзяржаўным удзелам.

У аснову праграмных прадуктаў закладзены найноўшыя тэхналогіі. Пры распрацоўцы выкарыстоўваецца фізіка-матэматычнае мадэляванне з ужываннем штучнага інтэлекту і высокапрадукцыйных вылічальных магутнасцяў.

Важна, што «Раснафта» не толькі стварае і прадае ПЗ, але і праводзіць навучанне карыстальнікаў і ажыццяўляе тэхнічную падтрымку праграмных прадуктаў. У 2022—2023 гадах праведзена больш за сто навучальных семінараў.

Варта адзначыць, што мерапрыемства арганізавана пры ўдзеле АНА «Інавацыйныя інжынірынгавыя цэнтр».

Больш падрабязна аб ПЗ «Раснафты» — на сайце **https://rn.digital/.**

## Слова — удзельнікам

***Антон Мацко,** начальнік аддзела інжынерна-тэхнічных разлікаў ТАА «Газпрам падземрамонт Урэнгой»:*

— Для нашага прадпрыемства асабліва важны праграмны комплекс «РН-ВЕКТАР», паколькі замежны вытворца софту, які ажыццяўляе разлікі гнуткіх помпава-кампрэсарных труб, перастаў даваць абнаўленні. У праграмным забеспячэнні «Раснафты» нам спадабаліся гібкасць аналітычнай мадэлі, зручнасць работы з вялікай колькасцю даных і пашыраны функцыянал, які дазваляе аналізаваць атрыманыя звесткі з якаснай візуалізацыяй.

***Аляксандр Пашалі,** дырэктар Дэпартамента навукова-тэхнічнага развіцця і інавацый «НК «Раснафта»:*

— Распрацоўка лінейкі навукаёмістага праграмнага забеспячэння для нафтавага інжынірынгу з'яўляецца не кароткачасовай актыўнасцю, звязанай з бягучым трэндам на ўсеагульную лічбавізацыю, не дзейнасцю, накіраванай выключна на атрыманне прыбытку, але з'яўляецца ўнёскам у нафтагазавую індустрыю, спосабам суменсага накаплення і захавання ведаў, забеспячэння нафтагазавай галіны крытычна важным для функцыянавання суверэнным інжынерным праграмным забеспячэннем.

***Максім Волкаў,** намеснік генеральнага дырэктара па тэхналагічным развіцці і інавацыях «РН-БашНДПІнафта»:*

— Тут ужо адзначалася, што ў аснове нашых праграмных прадуктаў закладзены найноўшыя тэхналогіі, што выкарыстоўваецца фізіка-матэматычнае мадэляванне з ужываннем высокапрадукцыйных вылічальных магутнасцяў і штучнага інтэлекту. Па тэхнічных характарыстыках праграмнае забеспячэнне «Раснафты» сапраўды пераўзыходзіць замежныя аналагі. Звяртаю ўвагу: «РН-БашНДПІнафта» аператыўна дапрацоўвае софт пад патрэбы канкрэтных заказчыкаў, а гэта практычна немагчыма ў выпадку з заходнім софтам.

***Аляксей Пестрыкаў,** менеджар упраўлення інавацыйных праектаў «НК «Раснафта»:*

— «Раснафта», мабыць, галоўная кампанія ў Расіі з пункту гледжання рэальных мер на шляху да лічбавага суверэнітэту. З 2005 года мы ствараем уласныя праграмныя прадукты, якія паспяхова замяшчаюць замежныя. У праектах па стварэнні софту мы выкарыстоўваем гібкую метадалогію распрацоўкі, гэта дазваляе аператыўна ўлічваць пажаданні карыстальнікаў і хутчэй атрымаць якасныя прадукты.




## Пункт гледжання экспертаў

***Аляксей Мухін,** генеральны дырэктар «Цэнтра палітычнай інфармацыі»:*

— За рэзанансными падзеямі апошніх гадоў мала хто заўважае поспехі расійскіх кампаній, якія ў найскладанейшых умовах ціску ўмудраюцца дэманстраваць поспехі ў сферы высокіх тэхналогій. Мяркуючы па заяве прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна на другім Еўразійскім эканамічным форуме, гэтыя поспехі сталі прычынай таго, што прагнозы адносна абвалу расійскай эканомікі «не спраўдзіліся і ўжо не спраўдзяцца».

Калі казаць па лічбах, то «Раснафтай» рэалізавана больш за 900 ліцэнзій нафтагазавым і нафтасэрвісным кампаніям, а больш за 3700 акадэмічных ліцэнзій яна наогул бязвыплатна перадала ў 24 вядучых ВНУ краіны для адукацыйных мэт.

Такая актыўнасць, безумоўна, выводзіць кампанію на першую лінію і лічбавага суверэнітэту, і суверэнізацыі вытворчасці ў краіне. Як ІТ-распрацоўкі, як паведамілі спецыялісты «Раснафты», практычна на 80 % замясцілі замежны софт у ключавых працэсах нафтагаздабычы. Што і трэба было даказаць.

***Аляксандр Фралоў,** намеснік генеральнага дырэктара Інстытута нацыянальнай энергетыкі:*

— У шырокай грамадскасці склалася памылковае ўяўленне аб нафтагазавай галіне. Мяркуецца, што здабыча нафты — працэс вельмі просты і нават немудрагелісты. Пры гэтым не ўлічваецца, што нафтагаз развівае матэрыялазнаўства, забяспечвае рост вытворчасці металургічнай і машынабудаўнічай прадукцыі, ўвдзе распрацоўкі ў галіне тонкай хіміі, укладае сродкі ў суднабудаўнічую галіну і развіццё праграмнага забеспячэння (ПЗ).

Найбольшы ўклад у развіццё расійскага ПЗ уносяць самі нафтагазавыя кампаніі. Адным з лідараў галіны з'яўляецца «Раснафта», яна стварае і ўкараняе навукаёмістае ПЗ, якое ахоплівае ключавыя працэсы здабычы нафты і газу.

***Валерый Андрыянаў,** эксперт «Інфа-ТЭК», дацэнт Фінансавага ўніверсітэта пры Урадзе РФ:*

— Ва ўмовах санкцый, уведзеных калектыўным Захадам супраць Расіі ў цэлым і яе паліўна-энергетычнага комплексу ў прыватнасці, найважнейшая задача — забяспечыць рэальны тэхналагічны суверэнітэт нашай нафтагазавай прамысловасці. І ў першую чаргу гэта датычыцца праграмнага забеспячэння, па якім залежнасць ад імпарту да пачатку цяперашняга дзесяцігоддзя дасягнула вельмі высокага, а па асобных пазіцыях — і крытычнага ўзроўню. На шчасце, у Расіі ёсць кампаніі, якія патурбаваліся аб рашэнні гэтай задачы «яшчэ ўчора».

Лідарам тут выступае кампанія «Раснафта», якая першая ў Расіі прыступіла да распрацоўкі шырокай лінейкі навукаёмістага праграмнага забеспячэння. Тое, што на дадзены момант ужо восем праграмных комплексаў «Раснафты» уключаны ў Адзіны рэестр расійскіх праграм для электронных вылічальных машын і баз даных, азначае: яны могуць набывацца кампаніямі з дзяржаўным удзелам. І гэтая прадукцыя сапраўды карыстаецца вялікім попытам.

ІНП 7702420062.

# Выбіраючы прафесію ратавальніка

**Урачыстая цырымонія выпуску ліцэістаў МНС адбудзецца 10 чэрвеня. У бягучым годзе гэта 16-ы выпуск навучэнцаў. Па традыцыі 47 выпускнікоў установяць памятную пліту, выканаюць вальс і прадэманструюць творчы нумар, а таксама развітаюцца са сцягам ліцэя і апошні раз пройдуць урачыстым маршам па пляцы навучальнай установы.**

Сярод выпускнікоў ліцэя 2023 года тры навучэнцы, якія скончылі яго з залатым медалём, — гэта Ягор Ключнікаў, Аляксандр Белавокі і Дзяніс Кацур.

Акрамя таго, для юнакоў прагучыць апошняя каманда ў сценах навучальнай установы «Вольна!», пасля якой у паветра ўзляцяць фуражкі, нагадвае аб традыцыі МНС.

Спецыялізаваны ліцэй пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС — сучасная ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі. Ён створаны 25 мая 2004 года па ініцыятыве і пры падтрымцы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Гомельскага аблвыканкама. У ліцэі МНС праходзіць навучанне юнакі з 7 да 11 класа. Практычна кожны трэці навучэнец — сірата або падлетак, які застаўся без апекі бацькоў. 60 працэнтаў навучэнцаў — дзеці з малазабяспечаных, няпоўных, шматдзетных, сацыяльна непаспяховых сем'яў. За гады існавання Спецыялізаванага ліцэя пры ўніверсітэце МНС установу скончылі больш за пяць соцень хлопцаў і дзяўчат, многія з якіх сталі прафесіяналамі-ратавальнікамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ведай нашых!

# У БЕЛАРУСІ — ДРУГОЕ МЕСЦА ПА ЛЯСІСТАСЦІ

## Гэта паказчык сярод краін СНД

**Такія вынікі статыстычнага агляду, падрыхтаванага Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь да Дня аховы навакольнага асяроддзя, паведамляе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Згодна са звесткамі на 1 студзеня 2023 года, у нашай краіне лесам пакрыта 40,1 працэнта тэрыторыі. Агульная плошчаляснога фонду Беларусі складае 9719,6 тысячы гектараў. Пры гэтым 100 працэнтаў лясных плошчаў ахоплена доўгатэрміновым планам кіравання.

Плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый складае 1904 тысячы гектараў — гэта 9,1 працэнта ад усёй плошчы краіны. У краіне



функцыянуюць адзін запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі, 375 заказнікаў і 958 помнікаў прыроды. У Чырвонай кнізе нашай краіны — 202 віды дзікіх жывёл і 303 віды дзікарослых раслін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАМБАЙНЫ, СЕЛЕКЦЫЙНЫЯ КУРЫ І БЕСПІЛОТНІКІ

## Што пабачыць на «Белагра-2023»




**Гэтымі днямі на базе выставачнага цэнтра Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» праходзіць міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Белагра-2023». Тут свае экспазіцыйныя блокі дэманструюць вытворцы сельскагаспадарчай тэхнікі, авіяцыйныя кампаніі, фермы і агракамбінаты, а галоўным нумарам стаў Эксперыментальны завод акадэміі навук. Мы пахадзілі і пагледзелі...**

### КАЛІ ДА ЦУКРУ ПАДЫХОДЗЯЦЬ З РОЗУМАМ

Упершыню ў Беларусі зроблены буртаўкладачны комплекс, які неабходны для прыёмкі цукровых буракоў на айчынных цукровых заводах. Распрацавалі гэты комплекс на «Эксперыментальным заводзе» пад эгідай навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Прадстаўляў гэты комплекс яго **дырэктар Аляксандр БЛІЗНЮК**. Па словах дырэктара, сёння з цукровымі буракамі працуюць састарэлыя імпартныя комплексы, якія часта ламаюцца і маюць слабую прадукцыйнасць. А прадукцыйнасць айчыннай супермашыны — 150 тон клубняў цукровых буракоў за гадзіну. Менавіта таму эксперты эксперыментальнага завода распрацавалі гэты комплекс практычна з нуля. Першы такі апарат ужо прададзены на Жабінкоўскі цукровы завод.

Аляксандр Блізнюк разлічвае, што яго завод будзе выпускаць да 10 гэтых грандыёзных, а галоўнае — карысных для нашых аграрыяў, комплексаў. Дырэктар завода разлічвае атрымаць мноства заказаў у «залатых» агратыдзень. І гэта не проста бравада, бо ў Расіі некалькі соцень цукровых заводаў і кожнаму не хапае нашага комплексу. А мы адкрытыя для супрацоўніцтва.

### БОЛЬШ ЗА 6 ТЫСЯЧ ТОН ЗБОЖЖА НА МАШЫНУ

Збожжаўборачны камбайн GS2124 з'яўляецца флагманам прадпрыемства «Гомсельмаш». Менавіта гэтая машына дазволіла дасягнуць рэкорду па намалоце летась, калі за сезон удалося сабраць 6 тысяч 60 тон збожжа, адзначыў **вядучы інжынер прадпрыемства Віктар ШАХ**. Дадзены вынік з'яўляецца сімбіёзам дзейнасці адразу некалькіх сістэм (электроніка, аграпілот, магутнае святлодыёднае асвятленне рабочай зоны), сілавая ўстаноўка магутнасцю 530 конскіх сіл, якая дазваляе пілоту апрацоўваць да 40 гектараў за змену. Сам камбайн мае прадукцыйнасць да 24 тон прадукцыі за гадзіну.

Характэрна, што менавіта гэты камбайн можа працаваць на высокіх хуткасцях (да 10 кіламетраў за гадзіну), у цёмны час сутак, на схілах і камяністых палях.

Спецыяліст адзначыў, што для вытворчасці большай колькасці прадукцыі з мінімальнымі выдаткамі ў гэтым камбайне прадугледжаны электронныя сістэмы дакладнага земляробства. Выкарыстанне гэтых сістэм дазваляе эканоміць сродкі вытворчасці, а таксама працоўны час тэхнікі і персаналу, павялічваць прыбытак сельгасарганізацый за кошт зніжэння выдаткаў вытворчасці.

Віктар Шах заўважыў, што на выстаўцы прадстаўлена ўся лінейка выпрацаваных на прадпрыемстве збожжаўборачных і кормаўборачных машын. Камбайны прадаюцца як у нашай краіне, так і за яе межамі. А самага папулярнага камбайна было прададзена звыш 22 тысяч адзінак. На думку спецыяліста, кіраўніцтва холдынга разлічвае прадаваць больш сваіх машын у Расію і ў іншыя краіны блізкага замежжа.

Апошнім часам тэхніка холдынга «Гомсельмаш» стала прадавацца ў Аргенціну і краіны Афрыкі.



### ЛІДСКАЯ ТЭХНІКА ЎЖО «БЕГАЕ» ПА ПАЛЯХ КЕНІІ І ЗІМБАБВЭ

**Начальнік упраўлення продажаў акцыянернага таварыства «Лідаграпраммаш» Мікалай ПІШЧЫК** паказаў нам адну, падобную на касмічную тэхніку, вельмі незвычайную машыну. Гэта апырскавальнік самаходны, незвычайнасць якога ў тым, што ў яго ў рост чалавека колы, якія вузкія і размешчаны далёка адзін ад аднаго. Гэтая машына апырсквае тэрыторыю па шырыні захопу роўнай 24 метры. Гэты механізм выкарыстоўваецца для ўнясення хімічных сродкаў абароны раслін і іх падкормкі. Характэрна, што на ўнутраным рынку апырскавальнік ведаюць ужо даўно і актыўна купляюць. А замежным пакупнікам прапануюць яго ўпершыню.




Спецыялізаванае прадпрыемства па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі з Ліды прапаноўвае на выстаўцы розныя сеялкі, тэхніку для нарыхтоўкі кармоў і бульбаўборачныя камбайны. Сёння лідскія машыны паступаюць не толькі айчынным спажыўцам, але і пакупнікам з Расіі і блізкага замежжа. Апошнім часам вялікія заказы на нашай тэхнікі паступілі з Афрыкі — з такіх краін, як Кенія і Зімбабвэ. Напрыклад, у Зімбабвэ ўжо прададзена каля 220 сеялак кукурузы. Наша тэхніка зарэкамендавала сябе на выдатна. З Афрыкі на выстаўку прыехалі таксама прадстаўнікі Конга і Нігерыі.

### НАША КУРАЧКА ЭПІДЭМІЙ НЕ БАІЦЦА

На прадпрыемстве бяруць інкубацыйнае яйка, інкубуюць яго і атрымліваюць бацькоўскія формы. Затым з «найчысцейшых» бацькоўскіх курэй бяруць апладненае яйка, і ў інкубатары выводзіцца сутачны маладняк, які далей ідзе на адкорм, растлумачыла **заатэхнік-селекцыянер філіяла «Мінскі» агракамбіната «Дзяржынскі» Лілія САДОЎСКАЯ**.

Паводле яе слоў, пакупнікам прапаноўваецца бройлерны маладняк і гатовыя тушкі. Тут ёсць куры розных парод: венгерская, брытанская — аж да каліфарнійскай стракатай, але нам спадабалася менавіта цёмна-чырвоная. Гэта мілыя курачкі беларускай селекцыі. Шкарлупіна яек у іх як карычневая, так і белая. Генафондная гаспадарка гэтай птушкі знаходзіцца ў Заслаўі, дзе займаюцца захаваннем чыста беларускай птушкі. Курачка айчыннай селекцыі адрозніваецца цягавітасцю, непераборлівасцю да корму і досыць устойлівая да розных захворванняў. Калі, напрыклад, будзе эпідэмія птушынага грыпу, дадзеную птушку яна не закране.

На жаль, у айчыннай пароды трохі ніжэйшая прадукцыйнасць і па мясе, і па яйках. Цяпер актыўна працуе селекцыя ў гэтым кірунку.



### «ЯСТРАБ» ПАКАРАЕ ПАВЕТРА

**Начальнік аддзела прадпрыемства «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» Кітайска-Беларускага закрытага акцыянернага таварыства Аляксандр КУЎШЫНАЎ** паказаў нам самы маленькі верталёт. Называецца гэты механізм аўтажыр «Ястраб». Гэта цалкам айчынная распрацоўка. Складаныя вузлы з электронікі, а дапрацоўка рухавіка ажыццяўляецца з тэхнічнай дапамогай нашых кітайскіх калег.

Дадзеная лятальная машына з'яўляецца двухмеснай і прызначана для палётаў па экалагічным маніторынгу, падчас разведкі лядовай і паводкавай абстаноўкі, а таксама патрулявання лясных масіваў, сельскагаспадарчых і паляўнічых угоддзяў. Акрамя таго, яго можна выкарыстоўваць пры пошуку пацярпелых службамі МНС, праводзіць кантроль стану нафтагазаправодаў і электраперадач высокага напружання. Пры жаданні з дапамогай аўтажыра можна ажыццяўляць маніторынгі аўтамабільных і чыгуначных магістраляў, выкарыстоўваць для навучальных і экскурсійных палётаў.

Непасрэдна ў сельскай гаспадарцы можна прымяняць яго ў якасці апырскавальніка невялікіх плошчаў. Але неабходна дадатковая ўстаноўка спецыяльнага абсталявання. Тады магчыма апрацоўваць да 400—500 гектараў за змену.

Гэты верталёт, у тым ліку, лётае на малых вышынях — аж да 1 метра над верхавінамі дрэў. Лічыцца самай бяспечнай машынай верталётнага тыпу. Можа прызямліцца без удзелу рухавіка. Пры пасадцы не патрабуе спецыяльнай паласы — дастаткова толькі ўмоўна роўная паверхня.

Гэты «Ястраб» — самы эканамічны верталёт сярод авіяцыйных сістэм. Пілот абаронены цалкам ад умоў надвор'я і нават пры абмежаванай бачнасці можа выкарыстоўваць пілатажна-авіяцыйнае абсталяванне.

Паказаў Аляксандр Куўшынаў даволі буйнога дрона. Гэта таксама айчынная распрацоўка (за выключэннем рухавіка і профілю складаных вінтоў). На гэтыя беспілотныя лятальныя апараты можна прымацоўваць мноства дадатковага абсталявання: звычайныя і спектральныя камеры абследавання тэрыторый для выявы індэкса расліннасці. Гэты індэкс паказвае, у якіх участках поля было ўнесена недастаткова ўгнаенняў.

У планах прадпрыемства — распрацоўка дронаў для місіі МНС. Менавіта з боку гэтага ведамства авіятары атрымалі першыя заказы. Спадзяюцца распрацоўшчыкі на буйныя заказы на дроны з Расійскай Федэрацыі. Пакуль што магутнасці прадпрыемства абмежаваныя вытворчасцю да 100 беспілотнікаў у год.

### СЫР ЗАЎСЁДЫ СМАЧНЕЙШЫ З УЛАСНАГА МАЛАКА

**Маркетолаг акцыянернага таварыства «Верхнядзвінскі масласырзавод» Віктар КРУПЕНЬКА** распавёў, што на іх прадпрыемстве перапрацоўваецца 240 тон малака за суткі, пасля чаго атрымліваецца 24 тоны сыру. Ужо даўно гэты завод вырабляе да 50 відаў сыру рознай тлустасці і тэрмінаў паспявання.

Лінейка элітных сыроў прадстаўлена гандлёвай маркай «Князь Альгерд», а традыцыйных сыроў па еўрапейскіх тэхналогіях — у гандлёвай марцы «Ян Сырадзел». Апошняя марка стала класікай нацыянальнай беларускай кухні. На выстаўцы прадстаўляецца сыр «Джугас», зроблены па літоўскай тэхналогіі. Гэты сыр, тыпу пармезана, мае працяглыя тэрміны паспявання (больш за год).

Акрамя таго, на прадпрыемстве сёлета распрацавалі новы сорт выключна беларускага сыру «Ільняны густ», які вельмі карысны для страввання. Тут, як заўсёды, чакаюць свайго роднага пакупніка, а таксама гасцей з-за мяжы, у асноўным з Расіі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Фота Віктара ІВАНЬЧЫКАВА.**

# ТАНЦПЛЯЦОЎКА, ЁГА І НАРМАТЫЎ ГПА

## КЛУБЫ, ГУРТКІ І МУЗЕІ

Нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце-2030» вызначае асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў інтарэсах пажылых грамадзян. Яе мэтай з'яўляецца фарміраванне грамадства для ўсіх узростаў. А таксама стварэнне ўмоў для найбольш поўнай рэалізацыі патэнцыялу пажылых людзей і паляпшэнне якасці жыцця.

— Актыўнае даўгалецце — гэта большая даступнасць для людзей старэйшага ўзросту навучання, працягу працоўнай дзейнасці, рэалізацыя іх патрэб і актыўнае прыцягненне ў грамадскую дзейнасць, — адзначае **кансультант галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вольга ДУБОВІК**. — Яшчэ адзін важны кампанент — здаровае даўгалецце. Мы разумеем, што не ўсе грамадзяне старэйшага ўзросту па стане здароўя могуць паўнацэнна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці і знаходзяцца ў няпростых умовах. Наша задача — забяспечыць ім догляд і клопат пры дапамозе сацыяльных работнікаў і сядзелак. Калі пажылы чалавек не можа жыць дома, то важна забяспечыць камфортнае пражыванне ў стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання.

Правесці вольны час актыўна, карысна і цікава пажылых людзей сёння запрашаюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тут арганізаваны розныя клубы, заняткі і курсы, якія праводзяцца як спецыялістамі, так і валанцёрамі. Імі становяцца як самі пажылыя людзі, так і моладзь. Запатрабаваны найперш розныя актыўнасці: танцы, аздараўленчая гімнастыка, скандынаўская хадзьба, ёга, прычым найчасцей па прынцыпе «роўны навучае роўнага».

Як паказвае практыка, сёння ўзрост для многіх людзей — не перашкода як для фізічнай актыўнасці, так і для навучання новаму. Напрыклад, у Гомельскай вобласці на курсах па камп'ютарна-лічбавай адукаванасці займаецца 92-гадовы мужчына. Цяпер такія навыкі для пажылых людзей, у якіх блізкія жывуць у іншым горадзе ці краіне, надзвычай важныя найперш для кантактавання. У Брэсцкай і Віцебскай абласцях вучанікамі па скандынаўскай хадзьбе з'яўляюцца 95—97-гадовыя жанчыны. Канешне, гэта пакуль не масавая з'ява, але прыкладаў актыўнага даўгалецця людзей, якім за 90 гадоў, апошнім часам усё больш.

Нярэдка пажылыя становяцца і валанцёрамі, сёння іх прынята называць валанцёрамі сярэбранага ўзросту. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці пажылая жанчына выкладае вязанне пруткамі і кручком. Адметна, што такі папулярны раней занятак вельмі запатрабаваны і цяпер. А вось мужчыны старэйшага ўзросту нярэдка займаюцца выкладаннем спеваў — такіх валанцёраў ва ўзросце, старэйшым за 80 гадоў, сёння нямала, адзначае Вольга Дубовік.

— У кожным рэгіёне створаны саветы пажылых грамадзян, якія ўдзельнічаюць у грамадскай дзейнасці, прыносяць свае ініцыятывы ў дзяржаўныя ўстановы і паспяхова рэалізоўваюць. Гэта і аднаўленне воінскіх помнікаў, акцыі па зборы сродкаў на аднаўленне воінскіх пахаванняў, — кажа спецыяліст.

У аграгарадку Заронава Віцебскай вобласці 62-гадовая Людміла Канстанцінаўна Нікіціна арганізавала музей «Гісторыя Заронаўскага краю». Яна ж з'яўляецца і стваральніцай музея «Цэнтр патрыятычнага выхавання насельніцтва», вядомага не толькі ў Беларусі, але і сярод гасцей з Расіі. Жанчына працуе як з моладдзю, так і з пенсіянерамі, выдае кнігі пра родны край і людзей розных прафесій.

— Штогод расце колькасць тых, хто наведвае аддзяленні дзённага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў. На першым месцы па папулярнасці сёння клубная дзейнасць — танцы, спевы, рукадзелле, творчыя заняткі. Далей ідуць фізкультурныя заняткі: ёга, скандынаўская хадзьба, розныя віды аздараўленчай гімнастыкі. Летась мы арганізавалі першую рэспубліканскую акцыю па скандынаўскай хадзьбе, калі амаль 2 тысячы пажылых чалавек аднachасова стартавалі ў розных пунктах краіны, — прыводзіць прыклад Вольга Дубовік.

Фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры летась вымушаны былі нават павялічыць колькасць груп для пажылых. Цяпер іх па краіне ўжо больш за 250, дзе займаецца каля трох тысяч чалавек. Тут заняткі, у адрозненне ад тэрытарыяльных цэнтраў, платныя, але скідкі для пажылых людзей складаюць ад 10 да 70 %. Тое ж датычыцца і басейнаў.

Яшчэ адзін спосаб актыўнага баўлення вольнага часу — на адкрытых танцавальных пляцоўках, якія некалькі гадоў таму былі адноўлены ў многіх гарадах. Нягледзячы на сезоннасць такога адпачынку, ён карыстаецца вялікай папулярнасцю. Сёння ў розных гарадах краіны танцпляцовак больш за сотню. Працуюць яны ў асноўным у гарадскіх парках з мая да кастрычніка. На сайтах паркаў можна загадзя пазнаёміцца з анонсамі тэматычных вечароў і іх датамі.

Каб забяспечыць належны клопат для пажылых людзей, адзначае Вольга Дубовік, развіваецца інфраструктура сацыяльных устаноў, укараняюцца новыя сацыяльныя тэхналогіі, такія як ажыццяўленне дзённага нагляду за пажылымі, навучанне сваякоў па доглядзе чалавека з пэўнымі захворваннямі, напрыклад, дэменцыяй.





## КЛОПАТ ПРА ЗДАРОЎЕ — З ДЗЯЦІНСТВА

Актыўнае даўгалецце магчымае, калі з дзяцінства весці актыўны і здаровы лад жыцця. Закласці такія правілы імкнуцца ў школе. Нацыянальны інстытут адукацыі распрацоўвае з гэтай нагоды шэраг праграм і факультатыўных заняткаў. У прыватнасці, вучэбную праграму «Культура здаровага ладу жыцця» для 9-10 класаў.

— Усе факультатыўныя заняткі дзіця наведвае толькі па пісьмовай заяве бацькоў, таму работа па фарміраванні здаровага ладу жыцця праводзіцца паралельна і з бацькамі, — адзначае **начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Наталля КАТОВІЧ**. — Яе вядуць настаўнікі, класныя кіраўнікі, сацыяльныя педагогі, педагогі-псіхолагі. Некалькі гадоў школы рэалізоўваюць праект «Бацькоўскі ўніверсітэт», таксама часткова прысвечаны адпаведнай тэматыцы.

Акцэнтам 6-га школьнага дня з'яўляецца спартыўна-масавыя і фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы — безумоўна, з удзелам бацькоў, якія разам з дзецьмі актыўна праводзяць час на спартыўных пляцоўках. Вялікую цікавасць выклікаюць такія рэспубліканскія акцыі, як «Тыдзень спорту і здароўя», міжнародныя і рэспубліканскія дні здароўя, рэспубліканскія спаборніцтвы па рухавых гульнях «Вас выклікае Спартландыя», рэспубліканскія спаборніцтвы «Алімпійскія надзеі Беларусі», «Снежны снайпер».

А вось дзейнічаць у крызісных умовах дзяцей навучаць на факультатыўных занятках «Мой псіхалагічны дабрабыт і дапамога равеснікам у крызіснай сітуацыі».

## ГАТОВЫЯ ДА ПРАЦЫ І АБАРОНЫ

Грамадскія аб'яднанні таксама далучаюць моладзь да здаровага ладу жыцця. У Беларусі, дарэчы, дзейнічае 186 грамадскіх маладзёжных аб'яднанняў. Прыкладна трэць з іх — спартыўныя арганізацыі. Гэта Беларуская асацыяцыя студэнцкага спорту, Беларуская федэрацыя кіберспорту, якія вядомы сваімі сучаснымі падыходамі і методыкамі работы з моладдзю. Самая масавая арганізацыя — БРСМ, таксама прапаноўвае шэраг ініцыятыў па здаровым ладзе жыцця. Адна з іх — «Тата-зала» — сямейны актыўны адпачынак, калі маладыя бацькі разам з дзецьмі бясплатна займаюцца ў спартыўных залах, а таксама ўдзельнічаюць у спаборніцтвах.

Яшчэ адна з масавых ініцыятыў — «народная зарадка». Гэта спорт, даступны кожнаму. Усе маладыя людзі, нягледзячы на ўзровень фізічнай падрыхтоўкі, могуць далучыцца і выканаць пасільныя практыкаванні. Адна з такіх акцый адбылася мінулай восенню ў Мінску, калі больш за тысячу маладых людзей сабраліся на стадыёне «Дынама». Традыцыйна да акцыі далучаюцца знакамітыя спартсмены, частымі гасцямі з'яўляюцца Анастасія Міронснчык-Іванова і Максім Недасекаў, якія праводзяць размінку і паказваюць практыкаванні. «Народныя зарадкі» праходзяць ва ўсіх рэгіёнах, чарговая адбудзецца ўжо ў чэрвені.

Яшчэ адзін падзабыты, але адноўлены кірунак — здача нарматываў ГПА. БРСМ сумесна з Міністэрствам спорту і турызму распрацаваў комплекс «Моладзь да працы і абароны» (МПА), які ўключае нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы з савецкага часу: іх выкананне дазваляе не толькі праверыць свае сілы, але і атрымаць нагрудны знак «Фізкультурнік Беларусі» трох ступеняў — бронзавы, сярэбраны і залаты. У праграме комплексу — бег на розныя дыстанцыі, адцісканні, віс на перакладзіне, скачкі ў даўжыню, а таксама ваенна-прыкладныя дысцыпліны — кіданне гранаты, зборка-разборка аўтамата.

— Кожны сучасны чалавек мусіць быць фізічна развіты, павінен умець пастаяць за сябе і выканаць свой грамадзянскі абавязак, — лічыць **старшыня савета Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый», сакратар Цэнтральнага камітэта ГА БРСМ Павел АЛЕКСА**. — На сайце міністэрства ёсць комплекс практыкаванняў па ўзростах. Можна хаця б з цікаўнасці паглядзець, ці выканаеце вы праграму для свайго ўзросту. Гэта не так і проста, улічваючы што сёння маладым людзям фізічнай актыўнасці не хапае.

## СТАРЭЦЬ НЕ СТРАШНА

Мерапрыемствы па навучанні здароваму ладу жыцця праводзіць і Беларускі Чырвоны Крыж. Гэта і прафілактыка неінфекцыйных хвароб, прасоўванне здаровага старэння.

— Старэнне — гэта дасягненне чалавека, раз ён дайшоў да пажылога і старога ўзросту. Адно з нашых мерапрыемстваў — вучыць людзей не баяцца старасці, — расказвае **начальнік аддзела медыка-сацыяльнай работы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Святлана АНАЦКА**. — Навучанне практыкуецца ў розных формах: майстар-класы, інфармацыйныя сесіі, трэнінгі па стандартах Міжнароднага Чырвонага Крыжа з улікам рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

У камандзе Беларускага Чырвонага крыжа каля 16 тысяч валанцёраў, якія працуюць па розных напрамках. Дапамогу пажылым аказваюць пераважна валанцёры сярэбранага ўзросту, якія самі сутыкнуліся з пэўнымі праблемамі. Гэта 133 ініцыятыўныя групы ў рэгіёнах краіны, якія аб'ядноўваюць 1,5 тысячы чалавек, з іх 60 % — пажылыя людзі, ёсць валанцёры, якія самі маюць інваліднасць.

Адна з задач Беларускага Чырвонага Крыжа — навучанне догляду блізкіх і сваякоў пажылых людзей, прафесіяналаў, сацыяльных работнікаў, валанцёраў. У прыватнасці, методыцы «кінестэтыкс», якая дазваляе хвораму чалавеку не губляць свае магчымасці для самаабслугоўвання, а таксама захаваць здаровую спіну таго, хто яго даглядае. У 2022 годзе праведзена 334 такія мерапрыемствы, навучанне прайшлі больш за 1300 чалавек.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «КОЛАЎ МЕНШ — НЕБЯСПЕКІ БОЛЬШ!»

**У мэтах прадухілення дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам мотатранспарту, прафілактыкі і папярэджання фактаў агрэсіўнага ваджэння, зніжэння рызык здзяйснення дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам і па віне кіроўцаў двухколавых транспартных сродкаў у перыяд да 12 чэрвеня на Міншчыне пройдзе акцыя «Колаў менш — небяспекі больш!». Пра гэта інфармуе УДАІ УУС аблвыканкама.**

Асноўныя фактары, якія аказваюць уплыў на цяжар наступстваў ДТЗ з удзелам мотатранспарту: адсутнасць навыкаў у кіроўцаў, парушэнне правілаў манеўравання, перавышэнне хуткасці, невыкарыстанне моташлемаў і адпаведнай экіпіроўкі.

З пачатку бягучага года на тэрыторыі Мінскай вобласці з удзелам кіроўцаў мотатранспарту адбылося 27 ДТЗ, у выніку якіх пяць чалавек загінулі, 25 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. 17 ДТЗ адбылося па віне саміх кіроўцаў двухколавых транспартных сродкаў.

У ходзе акцыі вартавымі дарог будзе весціся кантроль за дарожным рухам шляхам негалоснага і змешанага кантролю. Дадаткова арганізавана нясенне службы нарадамі ДПС ДАІ ў складзе мотапатруляў. У поле зроку праваахоўнікаў будуць знаходзіцца матацыклісты, якія кіруюць у стане ап'янення, не маюць права кіравання гэтым відам транспарту, парушаюць хуткасны рэжым, правілы абгону і манеўравання, а таксама кіроўцы двухколавага транспарту, сабранага саматужным спосабам або з канструктыўнымі зменамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ТУТ СПЯВАЮЦЬ НА «ЖАЎРУКОВАЙ МОВЕ»

## Трыццаць гадоў таму адбыўся першы фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне




**ТРЫЦЦАЦЬ гадоў таму ўвечары над маладзечанскім стадыёнам, запоўненым гледачамі, з верталёта пасыпаліся паўтары тысячы гваздзікоў і паўсотні ружаў... Так пачынаўся І Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна». Хоць дата ад году заснавання круглая, сёлетні фестываль адбываецца дваццаць другі раз і менавіта гэтымі днямі — 9—10 чэрвеня. Давайце ўспомнім, як ён калісьці пачынаўся, і паглядзім, чым радуе сёння.**




### СЛОВА — ПАЭЗІІ

Трыццаць гадоў таму ўпершыню сабралі ў Маладзечне спевакоў, кампазітараў, паэтаў, музыкаў дзеля мэты, якая тады была сфармулявана наступным чынам: «стварыць умовы для адраджэння нацыянальнай культуры, даць ёй новы імпульс, выявіць маладыя таленты». З тых часоў прынцып «захоўваць традыцыі, адкрываць маладыя таленты» спраўджваецца. Колькі маладых спевакоў пачало шлях да вялікага поспеху з маладзечанскай сцэны, колькі нашых улюбёных песень упершыню прагучала менавіта тут! І вельмі сімвалічна, што ўчора, перад першым урачыстым канцэртам, адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар ініцыятара з'яўлення фестывалю, легендарнага дырыжора Міхаіла Фінберга, які сваёй няўрымслівасцю, талентам надаў яму непаўторны каларыт...

Сёння заслужаны калектыў Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга — адзін з галоўных удзельнікаў фестывалю.

Адметны фестываль і тым, што задумваўся не толькі як музычны, але і як паэтычны. Беларускае паэтычнае слова суправаджае тут на кожным кроку, пачынаючы з праекта «Бачу Беларусь такой» — на банерах і інфармацыйных лістоўках, на аўтобусных прыпынках, у грамадскім транспарце, на білбордах і інфармацыйна-рэкламных стэндах можна прачытаць чатырохрадкоўі паэтаў-класікаў. Сёння паэтычныя чытанні адбываюцца ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка», а ў 17.00 у Палацы культуры адбудзецца літаратурна-музычная гасцёўня «Радзіма мая міралюбная», а таксама падвядзенне вынікаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Радком вярнуся па вясне» сярод маладых паэтаў у гонар памяці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь паэта Міколы Мятліцкага.

На кожным фестывалі гучаць песні на словы вядомага паэта Алеся БАДАКА, які сёння ўзначальвае выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

*— Памятаю, як удзельнічаў у самым першым фестывалі, які адбыўся ў 1993-м. Было здорава... Узнёсла... Адчувалася асаблівае хваляванне ва ўсіх, і ў арганізатараў, і ў выступоўцаў. Памятаю, як задоўга да самога фестывалю мы збіраліся — артысты, кампазітары, паэты — у кабінеце Міхаіла Фінберга і абмяркоўвалі, якім павінен быць фестываль, якія песні павінны прагучаць... Канешне, гэты форум — яркая з'ява на небасхіле беларускай культуры. Памятаю нават твары гледачоў на тым, першым, фестывалі — я не ведаю, хто яны, як іх завуць, але як шчыра яны рэагавалі на кожнае выступленне! Тады, дарэчы, паэты выступалі ўперамежку са спевакамі на галоўнай сцэне, і адчуванне свята, якое тады ўзнікла, помніцца па сёння. Не толькі для артыста, але і для паэта надзвычай важна, калі ты выходзіш на вялікую сцэну і бачыш зацікаўленыя твары, чуеш воплескі... Памятаю, як мы хадзілі па горадзе, а вуліцы былі спрэс запоўненыя людзьмі, і не толькі самімі маладзечанцамі, але і гасцямі, якія прыязджалі з усіх куткоў Беларусі. У першым канцэрце таксама бралі ўдзел госці, запомнілася выступленне Юрыя Антонава. Памятаю і конкурс маладых выканаўцаў... Тады Алена Саўленайтэ з песняй Ігара Паліводы на верш Максіма Багдановіча «Па-над белым пухам вішняў...» атрымала Гран-пры і аўтамабіль у падарунак. Я быў амаль што на ўсіх фестывалях... І не магу сказаць, што нейкія з наступных горшыя, у кожным свая «разынка». А тое, што найлепшыя традыцыі фестывалю працягваюцца і сёння, прыдумляюцца новыя цікавыя формы яго правядзення, безумоўна. Выдатна, што працягваецца конкурс маладых выканаўцаў. Я шмат разоў быў у яго журы і з цікавасцю назіраў, як маладыя спевакі паглыбляюцца ў беларускую паэзію. Зразумела, за трыццаць гадоў памянялася рытміка, манера выканання, памяняліся тэксты — тыя, што сёння пішуцца, не падобныя да тых, што гучалі ў 1990-х, але гэта нармальная з'ява. Мяняецца час, мяняемся мы... Калісьці ў Маладзечне дэбютавала мая песня «Заварожаная фея» ў выкананні Аляксандра Саладухі. А сёлета на фестывалі прагучыць песня на мае словы «Добрыя людзі» ў выкананні Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры».*

### РАДАСЦЬ, ЯК ПА НОТАХ

Песні заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь кампазітара Алега Елісеенкава ўпрыгожваюць кожны маладзечанскі фестываль. Сёлета ў гасцей фестывалю было дзве магчымасці сустрэцца з кампазітарам. Учора прайшоў праект «Асоба эпохі» — кампазітар стаў героем аўтарскай праграмы галоўнага рэдактара музычных праграм Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Таццяны Якушавай, якая і правяла сустрэчу. А ў вялікай зале Палаца мастацтваў адбыўся творчы вечар Алега Елісеенкава:

*— З фестывалем я супрацоўнічаю ад яго заснавання. У 1993 годзе мяне запрасілі прыняць удзел у канцэрце адкрыцця, які тады адбываўся на стадыёне, — яшчэ не збудавалі Летняга амфітэатра. Была пастаўлена агромністая сцэна, удзельнічалі ўсе вядучыя эстрадныя калектывы... Вядома, аснову складаў аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, таму што Фінберг быў ініцыятарам і фактычна стваральнікам гэтага фестывалю. І вось у канцэрце адкрыцця ён зрабіў мой аўтарскі блок — у рэпертуары артыстаў аркестра ўжо меліся мае песні. Іх выконвалі і салісты аркестра, і Аляксандр Саладуха, і Анатоль Ярмоленка з ансамблем «Сябры». Па-мойму, чатыры песні мае былі ў гэтым блоку... Памятаю, як я выйшаў на сцэну, як мяне прадстаўлялі вядучыя, у тым ліку як маладзечанца, земляка. Пасля я сеў за раяль... Бачыў шматтысячную глядацкую аўдыторыю, што запоўніла стадыён... Гэта наклала і вялікую адказнасць, і дало вялікую радасць. Я быў захоплены грандыёзнай падзеяй — грандыёзнай і для нашай краіны, і для Маладзечна, і для мяне. Сёлета, акрамя ўдзелу ў праекце Таццяны Якушавай «Асоба эпохі», у праграме фестывалю мой творчы вечар «Добрыя людзі», з удзелам цудоўных беларускіх артыстаў. Назву канцэрта мы далі паводле назвы песні на верш Алеся Бадака, якую выконвае Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры». Была падрыхтавана і прэм'ера маёй песні на словы Уладзіміра Мазго «Жаўруковая мова». Вельмі сімвалічна, што на фестывалі беларускай песні і паэзіі прагучала песня пра родную мову. Маладзечна — мой родны горад, хоць я даўно прыязджаю сюды як госць (я і напісаў нядаўна песню на вершы Алеся Бадака «Мы дома не госці», якая таксама, дарэчы, была ўключана ў праграму майго творчага вечара). Лічу, недарэмна менавіта ў Маладзечне прыжыўся фестываль беларускай песні і паэзіі — гэта высокакультурны, інтэлектуальны, развіты горад з цудоўнымі людзьмі, якія старанна рыхтуюцца да кожнага такога свята.*

**Адметны фестываль і тым, што задумваўся не толькі як музычны, але і як паэтычны. Беларускае паэтычнае слова суправаджае тут на кожным кроку, пачынаючы з праекта «Бачу Беларусь такой» — на банерах і інфармацыйных лістоўках, на аўтобусных прыпынках, у грамадскім транспарце, на білбордах і інфармацыйна-рэкламных стэндах можна прачытаць чатырохрадкоўі паэтаў-класікаў.**



### УЛАДА ГОЛАСУ

Конкурс маладых выканаўцаў у Маладзечне зрабіў вялікі ўплыў на лёс адной з салістак Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга, вядомай спявачкі Наталлі Тамела.

*— Гэты фестываль, вядома, прайшоў чырвонай стужкай праз усё маё жыццё. З яго я пачынала сваю творчую дзейнасць. Першае маё выступленне адбылося ў 1993 годзе, на самым першым фестывалі. Я ўжо працавала ў аркестры. А потым Міхаіл Якаўлевіч Фінберг сказаў: «У наступным конкурсе маладых выканаўцаў ты будзеш удзельнічаць, рыхтуйся». Кампазітар Эдуард Зарыцкі напісаў мне песню, была таксама песня «Грэх» Леаніда Захлеўнага — ад пачатку, праўда, яна належала Тамары Раеўскай, яна мне яе падарыла. Вось з гэтымі дзвюма песнямі я і выступала ў конкурсе. Праспявала, думаю, удала, мне далі першае месца... Для Міхаіла Фінберга фестываль значыў вельмі шмат, адпаведна, вельмі шмат ён значыў для ўсіх нас, яго артыстаў. Мы рыхтаваліся да «Маладзечна» загадзя, удасканальвалі сваю праграму, нешта мянялі... У фестываль укладзена шмат сіл і працы, найперш Міхаіла Якаўлевіча, але і ўсяго нашага аркестра, салістаў, музыкантаў, і важна, каб працягваліся закладзеныя Фінбергам традыцыі. Вельмі добра, што адкрылі мемарыяльную дошку ў яго гонар — мы, салісты, вырашылі выканаць падчас адкрыцця ўрывак з песні, прысвечанай Міхаілу Якаўлевічу, дзе ёсць словы «Анёл вас праводзіць да дзвярэй».*



Сёння XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023» завершыцца, мы паслухаем заключны канцэрт, даведаемся імёны пераможцаў конкурсу маладых выканаўцаў, будзем дзяліцца ўражаннямі... Пра ўсё гэта чытайце ўжо хутка на нашым сайце і ў рэпартажы на старонках «Звязды».

**Людміла ІВАНОВА.**

Далёкае і блізкае

# ПРЫСУТНАСЦЬ У СУЧАСНАСЦІ

**ТАЯМНІЦА фатаграфічнага адлюстравання часта раскрываецца не адразу.
Здымак крочыць не толькі ў нагу з сучаснасцю, а яшчэ ідзе следам за памяццю.
Ці болей правільным будзе сказаць: фотаздымак з'яўляецца дакументальнай памяццю.
І якім бы па якасці ён ні быў, заўжды абуджае эмоцыі, прымушае трывожыцца сэрца, нагрувашчвае адну думку на другую...**

Яўген КОКТЫШ — вялікі майстар сваёй фатаграфічнай справы, мастак у фатаграфіі. І разам з тым — дынамічны летапісец часу, творца, які зрабіў нават рэпартажны здымак мастацкім творам. Узіраешся ў твары народнага мастака Беларусі Георгія Паплаўскага, аўтара «Карнікаў» і аднаго з аўтараў «Блакаднай кнігі», «Я — з вогненнай вёскі» Алеся Адамовіча, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава — і адчуваеш іх прысутнасць у нашым часе. Васіль Быкаў углядаецца ў сэнс ілюстрацый, зробленых Георгіем Паплаўскім да яго твораў... А вось Паплаўскі і Адамовіч слухаюць мітрапаліта Філарэта, які ўжо стаў легендай нашай Беларусі. Васіль Уладзіміравіч, Алесь Адамовіч, Валянцін Тарас — у майстэрні Паплаўскага. Георгій Георгіевіч і яго калега Віктар Барабанцаў разглядаюць рэпрадукцыі на лістах з альбома разам з пісьменнікам Віктарам Карамазавым, які захоплена піша пра мастакоў у многіх сваіх аповесцях і нарысах...

Здымкі Яўгена Коктыша, на якіх мы бачым пісьменнікаў і мастакоў, нагадалі пра адзінства розных кірункаў мастацтва, пра тое, што пераканаўчы дыялог з чалавекам-асобай у імя яго светласці можна весці толькі разам — і з дапамогай надрукавангай кнігі, і з удзелам карціны, прадстаўленай на мастацкай выстаўцы, і ў зале філармоніі... Культура — сонечнае святло, праменьчыкамі ў якім выступаюць літаратура, тэатр, музыка, скульптура, выяўленчае мастацтва. І, аглядаючы даўнія здымкі, захоплена згадваеш, што такія яркія асобы ў памкненнях давесці нешта галоўнае і важнае да чытача, гледача, слухача былі разам.

Так, велічыні ў нашай айчыннай літаратуры, у нашай нацыянальнай культуры Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Георгій Паплаўскі былі разам... Яны разам — і ў фатаграфічнай памяці сапраўднага майстра, сапраўднага мастака фатаграфіі Яўгена Коктыша.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**










Прэм'ера

# Новы беларускі цырульнік

## Чым адметная пастаноўка італьянскага рэжысёра ў Вялікім?



**Гэтай прэм'еры чакалі, бо «Севільскі цырульнік» — адна з самых улюбёных опер, якая часта ставілася на сцэне Вялікага тэатра Беларусі. А тут — дзясятае ўвасабленне. І тым больш што ажыццяўлялі яго пастаноўшчыкі з радзімы кампазітара Джаакіна Расіні: рэжысёр Альда Тарабэла і мастак, аўтар сцэнаграфічнага рашэння і касцюмаў Энрыка Мусеніч. Італьянская опера, якая дэманструе магчымасці тэатра (бо патрабуе выканальніцкага майстэрства), і ці не самая лёгкая і захапляльная — што яшчэ трэба гледачу напрыканцы юбілейнага тэатральнага сезона? Чакалі, праўда.**

Сапраўды, ёсць спектаклі любімыя, якія цудоўна ўспрымае глядач ва ўсім свеце, яны павінны быць у рэпертуары, лічыць генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава. Паколькі над пастаноўкай працаваў італьянскі рэжысёр, мова спектакля — італьянская. Ды мала таго: пад пастаноўку яшчэ спецыяльна абвяшчалі кастынг, каб знайсці артыстаў, якія выканаюць галоўныя партыі. Таму імёны многіх выканаўцаў будуць адкрыццямі для айчыннай публікі. Праўда, некаторыя артысты ўжо выказалі жаданне працаваць у трупе Вялікага тэатра Беларусі. Нягледзячы на ўсю лёгкасць оперы Расіні, яна няпростая для выканання. Але гэта пастаноўка яшчэ і мае італьянскую інтэрпрэтацыю — можа, не адразу заўважную. Але на што зверне ўвагу дасведчаны глядач — максімальнае аднаўленне арыгінальнай партытуры, адкрыццё шмат якіх купюр, якія дазваляюць зразумець форму Расіні. На гэта пайшлі беларускі дырыжор-пастаноўшчык Уладзімір Авадок і рэжысёр Альда Тарабэла. Яны пазнаёміліся раней у італьянскім горадзе Лука, на радзіме Джакама Пучыні. Але сустрэліся падчас работы над «Севільскім цырульнікам»: гэтага рэжысёра параілі Вялікаму тэатру Беларусі колішні мастацкі кіраўнік тэатра «Ла Скала» Рыкарда Муці і «Равэна фестываль».

І вось адбылася і прэм'ера. Разваг пра яе будзе яшчэ шмат як у прафесійным асяродку, так і сярод гледачоў: пра рэжысёрскую канцэпцыю і яе акцёрскае ўвасабленне. Але каб лепш зразумець сутнасць пастаноўкі, важна ведаць, што было прынцыпова для стваральнікаў у гэтым спектаклі? Паслухаем **рэжысёра Альда ТАРАБЭЛА:**

**1. Інтэрпрэтацыя**

— Лірычная опера — гэта традыцыя не толькі ў Італіі, але і ва ўсім свеце. Таму важна мець малады склад выканаўцаў, каб працягваць гэтую традыцыю. Але яшчэ мы можам атрымаць спевака-акцёра, які будзе жыць на сцэне. Такім чынам мы можам узнавіць традыцыйны і неверагодна важны для італьянскай культуры жанр камедыі дэль артэ, фрагменты якой можна ўбачыць на сцэне. Паколькі ў некаторых сцэнах персанажы пераўвасабляюцца ў кананічныя архетыпічныя маскі з камедыі дэль артэ, якія ёсць у Карла Гальдоні і шэрагу італьянскіх аўтараў. Напрыклад, Фігара пераўвасабляецца ў Арлекіна, Разіна — у Каламбіну, Базіліа і Бартала — у Панталонэ.

**2. Імправізацыя**

— Складанасць работы была ў тым, што высокая арганізаванасць артыстаў патрабавала ад іх пастаянных пытанняў да рэжысёра: чаму той ці іншы рух павінен быць у гэтым месцы, што ён абазначае? Таму адна з маіх задач — максімальна захаваць адчуванне імправізацыі і прымусіць артыстаў існаваць унутры персанажа і ўнутры той ці іншай сцэны. Рэпертуар Вялікага тэатра Беларусі складаецца з вялікіх опер, адаптаваных пад рэчаіснасць. Адна з маіх задач была — прывезці з сабой куфар лёгкасці, радасці і забаўкі, паколькі гэтага патрабуе музыка Расіні. Опера была напісана ў кароткія тэрміны. Літаральна за два тыдні. І галоўнай задачай Расіні было забаўляць і прымусіць сваю публіку смяяцца.

**3. Партытура**

— Нават у італьянскіх тэатрах традыцыйна ёсць некаторыя купюры, калі абразаецца музыка. Але тут фактычна ўся музыка захаваная. У гэтым заслуга маэстра Авадка, які пастараўся паказаць максімальна аўтэнтычную партытуру Расіні, што дало каласальнае задавальненне.

**4. Менталітэт**

— Адна са складанасцяў, з якой я сутыкнуўся, калі пачаў працаваць з мясцовымі артыстамі, — тое, што кожны інтэрпрэтатар імкнуўся выдаць строгую суровую структуру персанажа. Галоўны пасыл быў у тым, каб кожнага максімальна прымусіць захаваць лёгкасць і ўважліва слухаць музыку Расіні. Таму што галоўная драматургія і характары ўсіх персанажаў закладзены ў ёй. Калі пачынаецца тая ці іншая тэма, то ногі імкнуцца танчыць, калі ўважліва слухаць музыку. Гэта матывуе і натхняе, каб быць максімальна натуральным на сцэне... Я часта ставіў «Севільскага цырульніка» на многіх сусветных сцэнах, і кожны раз ён быў розны.

**5. Артыстычнасць**

— Для нас таксама было важна выкарыстоўваць неверагодную лёгкасць і светлыню музыкі Расіні, якая правакуе ўсіх выканаўцаў на адпаведныя рухі. Для мяне было вялікім сюрпрызам тое, што я сустрэў на рэпетыцыйнай пляцоўцы беларускіх салістаў і запрошаных салістаў з Вялікага тэатра Расіі і з тэатраў іншых гарадоў, якія былі вельмі падрыхтаваныя да спецыфікі італьянскай мовы. Звычайна ёсць некаторыя абмежаванні і моўны парог, але тут быў каласальны цуд. Таму што, нягледзячы на тое што мы людзі з розных краін, мова, якая нас аб'ядноўвае, — гэта мова тэатра і музыкі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ОАО «БАРАНОВИЧСКАЯ ПТИЦЕФАБРИКА» извещает о проведении аукциона по продаже недвижимого имущества

**Аукцион состоится 22 июня 2023 года в 10.00 по адресу: Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, здание клуба ОАО «Барановичская птицефабрика»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Сведения о предмете аукциона Лот:** | Капитальное строение с инвентарным номером 112/С-6578 (наименование: магазин; назначение: здание специализированное розничной торговли), общей площадью 74,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Ганцевичский район, г. Ганцевичи, ул. Парковая, 12, на земельном участке с кадастровым номером 121650100001000235, площадью 0,0352 га | | |
| **Начальная цена без учета НДС руб.** | **22 750,00** | **Размер задатка, руб.** | **2 275,00** |

**Продавец и организатор аукцион**а: ОАО «Барановичская птицефабрика», 225350, п/о Русино, Барановичский район, Брестская область, 8 0163 644 768 (приемная), 644 694 (юр. сектор).
Задаток перечисляется с даты публикации данного извещения по 21 июня 2023 года на расчетный счет Продавца BY73BAPB 30124401000110000000 ОАО «Белагропромбанк», ул. Советская, 150, БИК BAPBBY2X, ОКПО 00745326, УНП 200177723. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты: единовременный платеж в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для их проведения

Договор купли-продажи объекта аукциона заключается не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией по адресу: 225350, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика»

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225350, Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика» с пометкой «На аукцион» с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 по рабочим дням по 21 июня 2023 года включительно

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Продавца www.zlatko.by, а также можно узнать по телефону 8 0163 644 694 (юр. сектор)

---

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61)
**по поручению районного унитарного предприятия «Любанское ЖКХ»**
(продавец, место нахождения: г. Любань, ул. Ленина, 2, тел. (8029) 195-05-55)
**проводит открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1: административное помещение с инв. № 643/D-6029, общей площадью 44,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45А-1 *(право хозяйственного ведения)*. Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623450100001003170, пл. – 0,0532 га.**
Начальная цена без НДС **– 15 440,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 1 544,00** бел. руб.
Объект обременен договором аренды по 15.03.2025.

**Лот № 2: административное помещение с инв. № 643/D-6030, общей площадью 77,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45А-4 *(право хозяйственного ведения)*. Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623450100001003170, пл. – 0,0532 га.**
Начальная цена без НДС **– 23 440,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 2 344,00** бел. руб.
Стоимость лотов снижена на 20 %.

Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.
Аукцион состоится **05.07.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.07.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801794) 68-7-06; (8029) 195-05-55.**

УНП 600208822

---

## ЧУП «СТЕПВИК» (организатор торгов) объявляет о проведении 11.07.2023 в 14.00 торгов в форме аукциона по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н по продаже имущества ИООО «АРХИГРУПП» (УНП 800013640) в связи с ликвидацией компании:

Лот № 1: производственный комплекс (совокупность оборудования) для изготовления оконных блоков:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 00000066 | Компрессорная установка СБ4/Ф-500.LB75 |
| 2 | 00000067 | Стружкоотсос мод. УВП-2000А (б/в) |
| 3 | 00000071 | Пила одноголовая для резки профиля из алюминия Graule |
| 4 | 00000072 | Пресс для стыковки углов Aluro б/у (пневматический) |
| 5 | 00000073 | Пресс для оконной фурнитуры 097I900.00 с подставкой 0970183.00 |
| 6 | 00000074 | Пресс для системы CW 50 97D900.00 с подставкой 0970183.00 |
| 7 | 00000075 | Пресс гидропневматический с рамой 095C500.00 и цилиндрами (4 шт.) 095C600.00 |
| 8 | 00000076 | Стол поворотный Lift-master (Reynaers) б/у |
| 9 | 00000077 | Транспортер роликовый Pertici Roller (с линейкой) б/у |
| 10 | 00000078 | Транспортер роликовый Pertici Visual EL (без лин.) б/у |
| 11 | 00000079 | Фреза одношпинд. копировальная Rotox KF 347/348 б/у |
| 12 | 00000080 | Фрейзерный двухшпиндельный станок Graule AS 450 б/у |
| 13 | 00000081 | Стол монтажный на колесных опорах 800х1300х3000 |
| 14 | 00000082 | Стол монтажный стационарный 800х1300х3000 |
| 15 | 00000083 | Тележка «Пирамида» |
| 16 | 00000084 | Тележка «Пирамида» |
| 17 | 00000085 | Тележка для транспортир. нарез. профиля 900х1600 |
| 18 | 00000150 | Станок торцовочный двухпильный мод. Blitz Alva 500A 6 м, Италия |
| 19 | 00000155 | Обрабатывающий центр Elumatetec SBZ122/20 в комплекте с мобильным терминалом и креплениями |
| 20 | 00000136 | Верт.-сверл. станок 750 Вт, 210-3100 об./мин., патрон 16 мм, конус шпинд. JT3, лазер B16RM HITACHI |
| 21 | Н/д. | Тележка для инструмента RockForce RF-55300 |
| 22 | Н/д. | Тележка для инструмента RockForce RF-55300 |

**Начальная стоимость производственного комплекса: 88 404,00 руб., в том числе НДС 14 734,00 руб.**
**Имущество продается единым неделимым комплексом.**
Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости предмета торгов **на 5 %.**
Победитель торгов принимает расходы по выплате вознаграждения организатора торгов в **размере 10 %** от стоимости продажи предмета торгов.
Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 2 рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата предмета торгов осуществляется в течение 2 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи предмета торгов на расчетный счет продавца. Оплата вознаграждения организатора торгов осуществляется в течение 2 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи предмета торгов на расчетный счет организатора торгов. Предмет торгов передается покупателю в течение 2 дней с момента оплаты стоимости предмета торгов и вознаграждения организатора торгов. Расходы по транспортировке предмета торгов относятся на покупателя. В случае неоплаты предмета торгов в течение 2 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи предмета торгов, договор считается расторгнутым.
*Задаток в размере 5 % от начальной стоимости предмета торгов для участия в торгах по продаже имущества ИООО «АРХИГРУПП» необходимо перечислить до 10.07.2023 г. на расчетный счет организатора торгов: ЧУП «СТЕПВИК», УНП 192672156, р/с BY96TECN3012 1614 0701 9000 0000 в ОАО Технобанк, 220002, г. Минск, код банка TECNBY22.*
Производственный комплекс находится в г. Минске. Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.
Заявления на участие в торгах, подтверждение внесения задатка, а также иные документы, необходимые для участия в торгах, направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by **в срок до 16.00 07.07.2023 г.**
Справки по тел. 8029 763-97-34 (вайбер, телеграм); 8017 326-22-32.

---

Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Коссовское МПО», Брестская область, Ивацевичский район, г. Коссово, ул. 3-го февраля, 7. УНП 200099007 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (**www.ipmtorgi.by).** УНП 191224638 |

**Предмет электронного аукциона**

**Здание детского сада** (назначение: здание специализированное для образования и (или) воспитания, общ. пл. 1072,6 кв. м, 122/С-24207, составные части: подвальный этаж, два забора, ворота).
Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Коссово, ул. Ленина, 2**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,4260 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания детского сада

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 14 592,00 бел. руб.**
(снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 7 (семь) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) рабочих дней** после подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

